

ЯК ПРАЦУЕ МАЛАДЫ СПЕЦЫЯЛІСТ У СЕЛЬСКАЙ АМБУЛАТОРЫІ МС

ТРАДЫЦЫІ СТАРАЖЫТНАГА ПРОМЫСЛУ БОРТНІЦТВА 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

19 КАСТРЫЧНІКА 2022 г.
СЕРАДА
№ 205 (29827)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Дзмітрый КАЛЕЧЫЦ, намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка:**

*«Мы правялі вялікую мэтанакіраваную работу для таго, каб умацаваць нашу плацежную інфраструктуру. Гэта дазваляе ў бягучых, дастаткова складаных, умовах адчуваць сябе больш-менш упэўнена, працаваць у рамках трансгранічнага ўзаемадзеяння. Калі гаварыць аб сістэмах перадачы паведамленняў, то ёсць альтэрнатывы. Большая частка пытанняў ляжыць у галіне карэспандэнцкіх адносін паміж банкамі з аднаго і другога боку. Адна з магчымасцяў ажыццяўлення плацяжоў — плацежная сістэма «Мір». Ёсць далейшыя планы па развіцці ўзаемадзеяння і з іншымі плацежнымі сістэмамі. На наш рынак прыходзіць кітайская UnionPay. У нас ёсць магчымасць плаціць у іншыя краіны звычайным банкаўскім плацяжом, ёсць магчымасць працаваць праз карткавы доступ. Мы стараемся максімальна дыверсіфікаваць магчымасці для нашых грамадзян і прадпрыемстваў працаваць на рынку плацяжоў».*

# Сакавіта-травяністы ўраджай



Фота БелТА.



Маладому механізатару Дзмітрыю ГЛЕЎКІЮ пашанцавала працаваць у перадавой гаспадарцы — калгас (ВСК) «50 гадоў Кастрычніка» з'яўляецца лідарам у Рэчыцкім раёне па нарыхтоўцы сакавітых і травяністых кармоў для буйной рагатай жывёлы. Цяпер у гаспадарцы актыўнымі тэмпамі вядзецца нарыхтоўка кукурузнага сіласу, плюшчэнне кукурузнага збожжа і нарыхтоўка сенажу з апошняга ўкосу траў. Ужо нарыхтавана 37,9 цэнтнера кармавых адзінак на адну ўмоўную галаву буйной рагатай жывёлы, а да канца нарыхтоўчага сезона ў гаспадарцы плануюць павялічыць паказчык да 40 цэнтнераў. Дзмітрый на сваім трактары працуе на адвозцы кукурузнага сіласу.




## АГОНЬ НЕ ДАРУЕ БЕСТУРБОТНАСЦІ



**На што звярнуць увагу, каб не дапусціць пажару?**

**Напярэдадні кожных летніх выхадных Міністэрства па надзвычайных сітуацыях рэкамендавала быць пільнымі на вадзе, асабліва берагчы дзяцей, — адпаведныя смс-паведамленні атрымліваў кожны, хто мае мабільны тэлефон. Хочацца верыць, што падобным спосабам удалося папярэдзіць не адну трагедыю. З пачаткам восені, а адпаведна, пажаранебяспечнага сезона, пры дапамозе смс-апавяшчэння ратавальнікі просяць грамадзян быць асцярожнымі пры абыходжанні з агнём, нагадваюць, што з-за бестурботнасці дарослых на пажарах гінуць дзеці...**

СТАР. 4

По палічках

## «ЗЯМЕЛЬНАЯ АМНІСТЫЯ» І ІНШЫЯ НАВАЦЫІ НОВАГА КОДЭКСА АБ ЗЯМЛІ



**Як вядома, 18 ліпеня бягучага года быў падпісаны закон аб змяненні Кодэкса аб зямлі. Кіраўнік нашай дзяржавы неаднаразова падкрэсліваў, што зямельныя рэсурсы, справядлівасць іх размеркавання — пытанне сацыяльнай стабільнасці грамадства.**

**Чаму ж прыйшлося змяніць заканадаўства? Кодэкс аб зямлі скарэкціраваны з улікам прапаноў грамадзян і патрабаванняў часу. Пра гэта на YouTube-канале БелТА расказаў начальнік Галоўнага ўпраўлення рэгулявання зямельных адносін, землеўпарадкавання і зямельнага кадастру Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Сяргей КАСТРОЎ.**

СТАР. 5

КОРАТКА

• Усе банкі Беларусі да II квартала 2023 года будуць эмітаваць карты БЕЛКАРТ.

• **Традыцыйны кінатыдзень «Тураўская восень» пройдзе ў Магілёве з 20 да 25 кастрычніка.**

• У Магілёве медыкі ўдасканальваюць правядзенне малаінвазіўных аперацый пры раку кішэчніка.

ISSN 1990 — 763X

З першых вуснаў

# «НАВУКА Ў НАС МНОГАЕ МОЖА»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам старшыню Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук. Уладзімір Гусакоў далажыў аб выкананні даручэнняў кіраўніка дзяржавы ў 2021—2022 гадах.**

Прэзідэнт адразу прапанаваў у лістападзе — пачатку снежня арганізаваць выстаўку дасягненняў вучоных Акадэміі навук. Ён заўважыў, што вопыт у правядзенні такіх выставак ёсць, Акадэмія навук неаднаразова іх праводзіла. «Не толькі для таго, каб вы зрабілі справаздачу, далажылі аб поспехах, але і каб народу паказаць, што мы можам і што навука ў нас многае можа. На жаль, мы мала прапагандуем не толькі Акадэмію навук, але і дасягненні нашай навукі. Таму трэба прадумаць, дзе мы можам паказаць людзям, што ўмеем рабіць. А паказаць ёсць што», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён прапанаваў правесці выстаўку ў суседнім з Палацам Незалежнасці будынку — НВЦ «БелЭкспа». «Месца там хапае. Проста кампактна вынесці туды асноўныя дасягненні навукі акадэмічнай і, нядрэнна было б, прыкладной. Ды і студэнты ўжо сёе-тое навучыліся рабіць. Падумайце, як гэта зрабіць», — сказаў Прэзідэнт.



Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, як рэалізоўваюцца яго даручэнні па асноўных напрамках. Ён нагадаў, што ў аграпрамысловай галіне ішла размова аб новай пародзе жывёл, аб новых раслінах і гэтак далей. Абмяркоўвалася распрацоўка айчынных аўтамабіляў, беспілотнікаў. «Як вы тут канкурыруеце з прыкладной навукай і з прадпрыемствамі, ствараючы новыя беспілотныя лятальныя апараты? Яны вельмі актуальныя, зыходзячы з урокаў вайны на Украіне», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Другое пытанне, вынесенае на абмеркаванне, — Статут Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Прэзідэнт адзначыў, што асноўныя элементы статута будуць разгледжаны і да канца года новы статут акадэміі будзе зацверджаны.

### «Я ПА БЮДЖЭТ НЕ ХАДЖУ»

Уладзімір Гусакоў далажыў Прэзідэнту, што сёння Акадэмія навук выбудавана зусім па-іншаму. У адпаведнасці з даручэннямі кіраўніка дзяржавы, строга арганізавана зверху данізу, нацэлена на зарабленне сродкаў. «Цяпер гэта ўжо не чыста бюджэтная арганізацыя, як яна была традыцыйна, усе сядзелі і чакалі бюджэту. Я па бюджэт зараз не хаджу. І усе ведаюць, што нават пры недахопе сродкаў мы нацэльваем, каб людзі зараблялі грошы», — сказаў ён. Старшыня Прэзідыума НАН Беларусі адзначыў, што за гэтыя гады Акадэмія навук выканала ўсе паказчыкі. Не было ні зніжэння, ні зрыву, усе паказчыкі выконваюцца ў адпаведнасці з планамі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**У тэму**

## ЯКУЮ СФЕРУ НІ ВАЗЬМІ — УСЮДЫ РАСПРАЦОЎКІ АКАДЭМІІ НАВУК

Нацыянальная акадэмія навук Беларусі актыўна ўдзельнічае ў вырашэнні актуальных задач тэхналагічнага развіцця і ажыццяўляе навуковае суправаджэнне шэрагу галін. Уладзімір Гусакоў падрабязней расказаў журналістам пра асноўныя напрамкі ў дзейнасці галоўнай навуковай установы краіны. Акадэмія навук прапануе стварыць у краіне буйное аб'яднанне ў галіне мікраэлектронікі — аб'яднаць усіх вытворцаў і распрацоўшчыкаў. Прычым не толькі з Акадэміі навук, але і Міністэрства прамысловасці і іншых ведамстваў, каб комплексна вырашаць гэтую праблему. Прэзідэнт прапанову падтрымаў.

Уладзімір Гусакоў далажыў кіраўніку дзяржавы аб развіцці электратранспарту. Гэта таксама важнае даручэнне беларускім навукоўцам. «Мы ўжо маем узоры нашага электратранспарту, некалькі мадэляў легкавога і грузавога аўтамабіляў на сто працэнтаў нашай распрацоўкі. Сёлета мы дэманстравалі і спартыўны электракар. Вядома, мэта і задача, каб гэта былі не толькі эфектыўныя, але і даступныя па кошце машыны. Нам трэба ствараць свой беларускі электрамабіль. І мы да гэтага гатовы. У нас ёсць распрацоўкі, і сюды трэба інтэграваць іншых вытворцаў», — адзначыў ён. Па яго словах, Беларусь мае кампетэнцыі па ўсіх пытаннях мікраэлектронікі.

Старшыня Прэзідыума НАН Беларусі расказаў, што беларуская вакцына супраць каранавіруса, якую распрацоўваюць вучоныя Акадэміі, прайшла даклінічныя выпрабаванні, паказала сваю эфектыўнасць. Напярэдадні яе чакаюць клінічныя выпрабаванні. Уладзімір Гусакоў выказаў спадзяванні, што ўсё будзе добра і ў наступным годзе можна будзе выходзіць на вытворчасць. У Акадэміі навук створаны цэнтр вірусалогіі, спецыялісты якога працуюць над вакцынамі розных відаў. «У тым ліку і вакцынамі супраць грыпу. Традыцыйна гэта імпартны прадукт, але мы будзем распрацоўваць самастойна. Напрацоўкі ёсць, і мы гатовы да вытворчасці вакцын у розных сферах», — расказаў Уладзімір Гусакоў. Таксама старшыня Прэзідыума НАН адзначыў, што акадэмія на сто працэнтаў забяспечвае патрэбы аграрна-прамысловага комплексу.

Уладзімір Гусакоў падкрэсліў, што пералік распрацовак Нацыянальнай акадэміі навук, якімі беларусы карыстаюцца кожны дзень, ідзе на сотні. «Электронным рэцэптам, электроннай карткай школьніка карыстаюцца ўсе. Медыцынскія прэпараты, на якіх напісана «Акадэмфарм». Ураджай без навукі мы б такі не атрымалі. Цэлая серыя нашых сартоў, пароды жывёл. Якую сферу ні вазьмі — усюды распрацоўкі Акадэміі навук, і прытым толькі за апошнія гады», — пералічыў ён, падкрэсліўшы, што Нацыянальная акадэмія навук — гэта не ўся навука краіны, а толькі трэць. Многія галіны, якія вядуць навуковую дзейнасць, не ўваходзяць у склад Акадэміі. Але праз адпаведныя праграмы НАН аб'ядноўвае іх вакол сябе.

«Акадэмія навук развіваецца як кластарная сістэма. Па сутнасці, навукова-вытворчая карпарацыя, бо тут навука не толькі фундаментальная, але і прыкладная, вытворчасць і продажы. Мы ідзём шляхам кластарызацыі ў форме навукова-практычных цэнтраў, аб'яднанняў. Каля 30 цэнтраў мы стварылі ў розных галінах, дзе каапяруем навукоўцаў з розных абласцей, каб гэта былі не адасобленыя, а сумесныя даследаванні з выхадам на вынік. Чаму мы маем такія распрацоўкі? Таму што аб'ядноўваем намаганні не толькі вучоных Акадэміі навук, але і міжведамасныя, і нават міжкраінавыя кластары. Нягледзячы ні на што, мы працягваем навуковае міжнароднае супрацоўніцтва», — расказаў Уладзімір Гусакоў.

# «РОЛІ РАЗМЕРКАВАЛА ГІСТОРЫЯ ДАЎНО»

## Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з расійскім філосафам і грамадскім дзеячам Аляксандрам Дугіным

**Размова доўжылася больш за дзве гадзіны.**



Кіраўнік дзяржавы прывітаў Аляксандра Дугіна ў Беларусі. «Мой перш за ўсё інтарэс заключаўся ў тым, каб вы на свае вочы паглядзелі, як жыве Беларусь. Вядома, як і Масква — не ўся Расія, і не ўся Беларусь — Мінск. Але, тым не менш, вы чалавек вопытны і па Мінску можаце вызначыць, чым дыхае наша Беларусь. Ваша Беларусь. Я спадзяюся, вы яе не адрываеце ў сваёй свядомасці і не лічыце чужой. Нягледзячы на тое, што сёння гэта незалежная суверэнная дзяржава», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Вядома», — пагадзіўся Аляксандр Дугін.

«Усё ж тое, што гавораць пра Беларусь у Расіі, і тое, што не гавораць, замоўчваючы... Для вас, напэўна, гэта невялікі сакрэт. Паколькі вы можаце бачыць за лічбамі, радкамі, коскамі рэальную карціну. Але людзі не вельмі, асабліва раней, разумелі, што адбываецца ў Беларусі. Часам нас крытыкавалі ні за што. Я разумею, ёсць нейкая (была) рэўнасць, яшчэ нешта. Розныя былі прычыны. Таму такога ўзроўню чалавек, як вы, публічны чалавек, які бачыць рэаліі... Я спадзяюся, што пра гэта (пра тое, як і чым жыве Беларусь. — **«Зв».**) даведаецца кожны не толькі рускі чалавек, але і расіянін. У гэтым вялікі мой інтарэс. Таму што нам жыць разам. Нам ні ў якім разе не трэба бегчы ў бок адзін ад аднаго», — падкрэсліў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што яго любімай дысцыплінай у ВНУ была філасофія, і сустрэча з Аляксандрам Дугіным прымусіла яго ў нейкай ступені акунуцца ў гэту філасофію. «Паглядзець на вашы погляды і ўспомніць тую філасофію, якую я вывучаў, — марксісцка-ленінскую. Вось час прайшоў. Аказваецца, нічога лепшага ж мы не стварылі. «Вось, марксізм-ленінізм — гэта дрэнна». Можа, і дрэнна. Але мы нічога лепшага не стварылі. А гэта была цэлая сістэма поглядаў. Сёння ў нас гэтага няма», — сказаў Прэзідэнт.

«І правільна вы недзе там гаварылі пра дзяржаўную ідэалогію, ідэалогію ўвогуле. І што ў нас яе няма. У Расіі тым больш яе няма. Гэта таксама праўда, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Мне прапаноўвалі мора ідэй, якія з прэтэнзіяй на дзяржаўныя. Я іх усе адкінуў, таму што яны не кладуцца на душу, на сэрца чалавека. Што за ідэя, якая не можа авалодаць масамі, як класік казаў, і не кладзецца на сэрца? Гэта не ідэя. І не можа яна быць дзяржаўнай ідэяй». Але пакуль нічога не нарадзілася, на жаль».

«Я і сам спрабую неяк нешта сфармуляваць. Але прыходжу да высновы, што гэта немагчыма сфармуляваць, пакуль цябе не падапрэ час. Пакуль час цябе не прымусіць яе сфармуляваць. Вось я ўжо да гэтага пачынаю прыходзіць і думаю: можа, мы дарма занадта напружваемся. Выдумаць яе нельга. Яна павінна саспець», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы

«Калісьці, я памятаю, груба скажу: хіхікалі ў Расіі некаторыя, як я іх называю, ліберасты. Калі я сказаў, што прыйдзе час (гады два таму было сказана), калі нам з Пуціным давядзецца стаяць спінай да спіны і адстрэльвацца. Усе: «Ну як гэта так, што!?» Што мы бачым сёння? Мы гэта сёння і бачым», — канстатаваў беларускі лідар.

«Таму нам трэба трымацца адзін каля аднаго. Не трэба спрабаваць неяк абысці адзін аднаго, не трэба тут нечага дзяліць. Тыпу нашай агульнай Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Усё зразумела, ролі размеркавала гісторыя даўно», — упэўнены кіраўнік дзяржавы.

«Я ад пачатку прыхільнік і Беларусі, і вашага курсу. Ніколі ў ім не сумняваўся. У самыя складаныя часы (паміж нашымі дзяржавамі былі складаныя часы) я ўсёй душой, усім сэрцам, усімі сваімі магчымасцямі падтрымліваў вас, тую лінію, якую вы праводзілі», — сказаў Аляксандр Дугін.

«Вы не далі разрабаваць сваю дзяржаву, не здзейснілі тых памылак, якія, на жаль, мы ў 1990-я гады здзейснілі і цяпер выпраўляем з такой цяжкасцю. Я шчыра схіляюся перад вашым аўтарытэтам, перад вашай мужнасцю, перад вашай перакананай устойлівасцю ў выратаванні беларускага народа, беларускай дзяржаўнасці. А значыць, нас саміх. Значыць, нашага адзінства, нашай Саюзнай дзяржавы», — падкрэсліў грамадскі дзеяч.

«Нейкія элементы беларускай ідэі склаліся яшчэ ў Вялікім княстве Літоўскім. І тады беларуская ідэнтычнасць стала набываць пэўныя формы. І тыя, хто хоча выкарыстоўваць яе супраць Беларусі, здзяйсняюць падмену. Таму што беларуская ідэя — гэта вельмі сур'ёзная частка нашай агульнай спадчыны. Мы павінны таксама да гэтага паставіцца ўважліва. Гэта наша, а не іх. Мы не павінны аддаваць ворагам тое, што з'яўляецца нашым», — падкрэсліў філосаф.

«Гэтаксама яны і рускі нацыяналізм спрабуюць штучна супрацьпаставіць нашай шматнацыянальнай дзяржаве. Гэта значыць, не заўсёды нацыянальная ідэя ў правільных руках аказваецца. Яна павінна быць у нашых руках», — падкрэсліў Аляксандр Дугін.

**Паводле БелТА.**

## УРАДЖАЙ, ЭКСПАРТ, МЕЛІЯРАЦЫЯ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заслухаў падрабязны даклад віцэ-прэм'ера, які курыруе АПК, Леаніда Зайца.**

У гэтым годзе зроблена павінна быць усё — аж да ўздыму зябліва — на гэта звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. На праблемныя пытанні, вядома ж, таксама звярнулі ўвагу — у сёлетнім сезоне аграрыі зацягнулі з уборкай лёну і бульбы.

Акрамя таго, з тэм, якія абмяркоўваліся, — пытанне экспарту айчынных прадуктаў харчавання. Леанід Заяц як віцэ-прэм'ер дадзеную тэму курыруе асабіста. Ён далажыў Прэзідэнту аб перспектывах і планах. Прагучалі і канкрэтныя даручэнні.

У ходзе даклада ішла размова і аб меліярацыі. Зямлю неабходна прывесці ў парадак, таму тэме на ўзроўні Прэзідэнта надаецца асаблівае значэнне.

Яшчэ адно прынцыповае даручэнне кіраўніка дзяржавы — выкараненне пасрэдніцтва ў сферы сельскай гаспадаркі. Гэтае пытанне таксама віцэ-прэм'еру даручана ўзяць на кантроль.

**БелТА.**

Повязь пакаленняў

# «Наша моладзь не дапускае забыцця гісторыі»

## Падведзены вынікі акцыі «Аднаўленне святынь Беларусі. Нас аб'ядноўвае гісторыя і вера»

**Вынікі рэспубліканскай міжканфесійнай дабрачыннай акцыі «Аднаўленне святынь Беларусі. Нас аб'ядноўвае гісторыя і вера» былі падведзены ўчора ў Мінску.**

У гэты дзень разгарнулася тэматычная працоўная акцыя, пры тым адначасова на двух аб'ектах: брацкай магіле на Усходніх могілках і тэрыторыі Нацыянальнага мемарыяльнага комплексу «Храм-помнік у гонар Усіх святых і ў памяць аб ахвярах, што выратаванню Айчыны нашай паслужылі».

На 24-м участку Усходніх могілак захаваны астанкі 190 воінаў, якія загінулі за вызваленне Мінска ў 1941—1945 гадах. Валанцёры прыбралі прылеглыя тэрыторыі, працерлі помнікі. Самым творчым было дадзена заданне пафарбаваць лаўкі. Пасля працы моладзь запаліла свечкі ў гонар памяці герояў-вызваліцеляў і ўсклала кветкі да мемарыяла. На тэрыторыі храма-помніка таксама разгарнуліся грамадска карысныя работы. Там добраахвотнікі БРСМ аказалі дапамогу ў афарбоўцы лавак.

— Сімвалічна, што ў фінале нашага рэспубліканскага праекта мы добраўпарадкоўваем менавіта храм-помнік і брацкае пахаванне, — падкрэсліла Аляксандра Ганчарова, сакратар цэнтральнага камітэта БРСМ, каардынатар валанцёрскага руху «Добрае Сэрца». — У іншых краінах воінскія пахаванні зносяцца. Наша моладзь не дапускае забыцця гісторыі і нагадвае, што ў сэрцы кожнага беларуса, няхай нават юнага, гэтая гісторыя вельмі важная, актуальная для кожнай сям'і.

Адным з цэнтральных мерапрыемстваў дня стала алічбоўка нацыянальнай святыні — крыпты Храма-помніка з устаноўкай у ёй таблічкі «Лічбавая зорка», што дае магчымасць усім ахвотным адсканаваць код і прачытаць цікавую інфармацыю пра алічбаваны аб'ект.





— Гэты помнік і гэтая «Лічбавая зорка» стане 1129-м з усіх алічбаваных на тэрыторыі нашай краіны, — каментуе **Аляксандр Лук'янаў, першы сакратар ЦК БРСМ**. — Мы вельмі рады, што моладзь актыўна далучылася да гэтага праекта, і сёння, алічбоўваючы храм-помнік, мы ўпісваем новую старонку ў агульны летапіс слаўных перамог нашых дзядоў і прадзедаў.

Таксама ў гэты дзень адбылася прэм'ера навукова-асветніцкага фільма «Трасцянец. Памяць агульная». Ініцыятарамі яго стварэння выступілі Беларускі культурны цэнтр духоўнага адраджэння і Усіхсвяцкі прыход Мінска. Адной з асноўных задач фільма Аляксандр Гасцеў, дырэктар дзяржаўнай установы «Беларускі культурны цэнтр духоўнага Адраджэння», назваў увекавечанне памяці ахвяр лагера смерці «Трасцянец» з улікам новых звестак, якія з'явіліся пры расследаванні справы аб генацыдзе беларускага народа.

У фінальнай акцыі прыняло ўдзел 100 валанцёраў руху «Добрае Сэрца» з усіх рэгіёнаў краіны, маладзёжных валанцёрскіх каманд РУП «Белмытсэрвіс», Савета маладых адвакатаў БРКА, а таксама прадстаўнікоў вядучых рэлігійных канфесій Беларусі. Яны атрымалі ўзнагароды па выніках акцыі.

Трэба адзначыць, што валанцёрскі рух «Добрае Сэрца» зараз аб'ядноўвае каля 33 тысяч маладых людзей ва ўзросце ад 14 да 31 года. Сярод іх — школьнікі, студэнты і працоўная моладзь.

Сёлета, у Год гістарычнай памяці, у акцыі «Аднаўленне святынь Беларусі» прынялі ўдзел 3600 валанцёраў руху «Добрае Сэрца». Такім чынам пад слоганам «Нас аб'ядноўвае гісторыя і вера» актыўная моладзь добраўпарадкавала 274 святыні. Увогуле, праект існуе з 2013 года. У 2016-м пры падтрымцы апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Рэспублікі Беларусь акцыя стала міжканфесійнай.



**Лізавета ГОЛАД,**
**фота аўтара.**

# АГУЛЬНАЕ Ў КЛАСІКАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ




**Аўдыягід па творчасці беларускіх і расійскіх пісьменнікаў ствараюць студэнты БДУ і Пскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта.**

Сумесны праект накіраваны на ўмацаванне культурных сувязяў паміж краінамі, папулярызацыю малавядомых фактаў з біяграфіі класікаў і ўплыву творчасці Аляксандра Пушкіна на сусветную літаратуру.

Над ім працуюць трэцякурснікі факультэта журналістыкі БДУ Ксенія Волкава і Міхаіл Мурза, чацвёртакурсніца журфака Лізавета Арлова і студэнты Пскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта Дар'я Шумаркіна, Даніїл Марынаў і Мікіта Якаўлеў. Ад Беларусі каардынатарам выступае выкладчык факультэта журналістыкі БДУ Максім Цюцянькоў.

«Мы знайшлі шмат агульнага ў пісьменнікаў з Беларусі і Расіі. Склаўшы іх творчыя партрэты, заўважылі ўзаемасувязь са спадчынай Аляксандра Пушкіна. Ёсць факты яго вандровак па Беларусі і знаёмстваў з нашымі землякамі. Пскоўская вобласць асобнай старонкай уплецена ў яго лёс. Мама рускага паэта з гэтага рэгіёна, і ён сам доўгі час знаходзіўся ў ссылцы на Пскоўшчыне», — дзеліцца Максім Цюцянькоў.

Структурна аўдыягід складаецца з васьмі дзесяціхвілінных блокаў. Палову з іх прысвецяць беларускім класікам, а ў другой частцы прапануюць творчасць рускіх паэтаў. На дадзены момант распрацаваны план, гатовы пілотны выпуск праекта. У ім расказваецца пра ўплыў Аляксандра Пушкіна на стыль, мову і паэзію Адама Міцкевіча, Янкі Купалы і Якуба Коласа. Тэкст студэнты рыхтуюць самастойна, выкарыстоўваючы навуковую і літаратуразнаўчую літаратуру. Дакладнасць выкладзеных фактаў правярае прафесар факультэта рускай філалогіі і замежных моў Пскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта Людміла Капітанава.

Плануецца, што аўдыягід запусцяць у сакавіку для выкарыстання ў экскурсійных маршрутах па пасёлку Пушкінскія Горы (Пскоўская вобласць).

Студэнцкая работа ўжо атрымала высокую ацэнку на Міжнародным маладзёжным форуме праектных ініцыятыў «Наследнікі», які завяршыўся 8 кастрычніка ў Пскове. Сумесную беларуска-расійскую ініцыятыву адзначылі дыпломам «За перспектыўнае супрацоўніцтва ў сферы сацыяльных праектаў».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# МАРАФОН ЧЫТАННЯ КОЛАСА

**Флэшмоб бесперапыннага чытання Якуба Коласа ўпершыню пройдзе 3 лістапада ў БДУ. Акцыя «Коласаўскі марафон. Новая зямля. На стрыме» прымеркавана да 140-годдзя з дня нараджэння народнага паэта Беларусі. Мерапрыемства накіравана на папулярызацыю беларускай культуры, захаванне і развіццё нацыянальных літаратурных традыцый.**

«На працягу шасці з паловай гадзін удзельнікі флэшмобу будуць перадаваць эстафету адзін аднаму ў чытанні галоўнага твора Якуба Коласа «Новая зямля». Урыўкі з паэмы агучаць студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі ВНУ. Кожны з іх пакажа сваё майстэрства ў дэкламаванні і выразным чытанні. Мяркуецца, што за абазначаны час удзельнікі цалкам прачытаюць паэму», — расказалі ў прэс-службе ВНУ.

Адметнасцю флэшмобу стане яго прамая анлайн-трансляцыя на Youtube-канале.

Да ўдзелу запрашаюцца ўсе жадаючыя супрацоўнікі і студэнты БДУ. Для гэтага трэба прайсці папярэднюю рэгістрацыю.

Арганізатарам марафону чытання выступае Фундаментальная бібліятэка БДУ.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Прэм'ер Брытаніі Ліз Трас адмаўляецца сыходзіць у адстаўку



Трас, якая займае пасаду кіраўніка брытанскага ўрада з 6 верасня, паспела так нашкодзіць эканоміцы краіны, што пазбавіцца ад палітыка зараз марыць не толькі народ і апазіцыя, але і аднапартыйцы.

Сама ж Ліз Трас упэўнена, што цяперашняе становішча ў Злучаным Каралеўстве не спрыяе змене кіраўніцтва і ў адстаўку ісці адмаўляецца, нягледзячы на заклікі парламентарыяў-кансерватараў.

— Мы перажываем вельмі цяжкія часы. Мы проста не можам дазволіць сабе марнаваць час на размовы, — упэўнена Трас.

Прадстаўлены ў канцы верасня Трас міністрам фінансаў Квазі Квартэнгам план эканамічнага развіцця краіны абрынуў брытанскія рынкі і практычна давёў да парытэту фунта стэрлінгаў і долара ЗША.

## Bloomberg: Еўрасаюз адмовіўся ад планаў уводзіць «паталок» коштаў на газ з Расіі

Еўрапейскі саюз часова адмовіўся ад планаў уводзіць верхнюю планку цэн на газ з-за рознагалоссяў паміж краінамі, паведамляе агенцтва Bloomberg са спасылкай на праект дакумента ЕС.

«Надышоў час дзейнічаць, як гэтай зімой, так і ў далейшым. Цяперашняя сітуацыя выклікае эканамічныя і сацыяльныя цяжкасці, кладучыся вялікім цяжарам на грамадзян і на эканоміку. Павелічэнне цаны энергарэсурсаў прыводзіць да зніжэння пакупніцкай здольнасці грамадзян і страты канкурэнтаздольнасці кампаній», — паказана ў чарнавым варыянце праекта Еўракамісіі па мерах для барацьбы з рэзкім ростам цэн на энерганосьбіты.

Гатовы праект мусіў быць прадстаўлены ў аўторак, 18 кастрычніка.

## Археолагі знайшлі ў Польшчы сляды вымерлага віду чалавека

Антраполагі з Варшаўскага ўніверсітэта вывучылі знойдзеныя ў польскай пячоры Тунэль-Вялікі 50 гадоў таму каменныя прылады і прыйшлі да высновы, што яны належалі вымерламу віду чалавека. Праца навукоўцаў была апублікаваная ў часопісе Scientific Reports.

Па даных вучоных, гэтыя прылады прызнаны аднымі з найстаражытнейшых, калі-небудзь знойдзеных у гэтым рэгіёне. Раней меркавалася, што ўзрост знойдзеных у пячоры гармат складае максімум некалькі дзясяткаў тысяч гадоў. Аднак аналіз паказаў, што інструменты можна датаваць узростам ад 450 000 да 550 000 гадоў.

Вучоныя мяркуюць, што інструменты былі зроблены вымерлым чалавечым відам Homo heidelbergensis (гейдэльбергскі чалавек). Яны лічаць гейдэльбергскага чалавека апошнім агульным продкам неандэртальцаў і сучасных людзей.

# АГОНЬ НЕ ДАРУЕ БЕСТУРБОТНАСЦІ

## ТРАГІЧНЫЯ «ЭКСПЕРЫМЕНТЫ»

Днём 4 кастрычніка ратавальнікі атрымалі сігнал аб пажары ў адной з кватэр дзевяціпавярховага жылога дома ў Мінску. Выратаваць знойдзенага гаспадара і яго сына 2017 года нараджэння не ўдалося...

Жудасная трагедыя адбылася вечарам 9 кастрычніка ў Барысаве. Ратавальнікам паступіла паведамленне аб узгаранні ў адной з кватэр шматпавярховіка. Падчас ліквідацыі пажару супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях выявілі трох чалавек. Усе з іх — 37-гадовая жанчына, а таксама дзеці трох і сямі гадоў — знаходзіліся ў беспрытомным стане. Нягледзячы на намаганні ўрачоў, выратаваць брацiка і сястрычку не ўдалося. Жанчына, іх маці, па сёння знаходзіцца ва ўстанове аховы здароўя.

Дык што ж здарылася ў той дзень? Па папярэдняй версіі следства (Следчым камітэтам узбуджана крымінальная справа), незадоўга да трагедыі бацькі ўжывалі алкагольныя напоі, пасля чаго заснулі. Без нагляду засталіся іх трое непаўналетніх дзяцей: трох, шасці і сямі гадоў. Малыя не прыдумалі нічога лепшага, як пагуляць з агнём: па папярэдняй інфармацыі, менавіта дзіцячае свавольства стала прычынай трагедыі. Калі ўзнік пажар, самастойна яго патушыць дзеці не змаглі. Не былі здольныя на гэта і дарослыя. Пакінуць моцна задымленае памяшканне, якое гарэла адкрытым полымем, змаглі толькі бацька і шасцігадовая дзяўчынка.

Яшчэ адно свавольства дзяцей у ліпені вылілася ў пажар, які адбыўся ў аграгарадку Багушэвічы, што ў Бярэзінскім раёне. На шчасце, у гэтым выпадку абышлося без ахвяр. Затое пра новы дах над галавой бацькам юных «эксперыментатараў» паклапаціцца прыйшлося: ад іх ранейшага жылля мала што засталося. Напярэдадні дзеці гаспадароў — дзевяці і адзінаццаці гадоў, якія засталіся адны дома, — вырашылі прыгатаваць поп-корн з крупаў. Ідэю «эксперыменту» хлопцы падгледзелі ў адной з сацыяльных сетак. Дзеці нагрэлі сланечнікавы алей да такой ступені, што ён загарэўся. Хлопцы не прыдумалі нічога лепшага, як патушыць полымя вадой, чаго рабіць катэгарычна нельга. У выніку адбыўся выбух, і агонь распаўсюдзіўся па ўсёй кухні. На шчасце, юныя «эксперыментатары» своечасова пакінулі хату, іх жыццю і здароўю нічога не пагражала.

Дзіцячае свавольства з агнём — адна з прычын пажараў. Многіх трагедый можна было б пазбегнуць, калі б побач з непаўналетнімі ў гэты небяспечны момант знаходзіўся хтосьці з дарослых. Дарослы чалавек здольны самастойна справіцца з невялікім узгараннем, рацыянальна ацаніць абстаноўку, дапамагчы ўсім жыхарам пакінуць жыллё ў выпадку, калі патушыць агонь не ўдалося. Аднак, як сведчыць статыстыка, нават дарослыя ў такіх сітуацыях часта не памочнікі: будучы ў стане алкагольнага ап'янення, яны не могуць дапамагчы не толькі навакольным, але і сабе.

І калі ад п'янства чалавецтва, напэўна, ніколі не пазбавіцца, то прадухіліць дзіцячае свавольства з агнём цалкам магчыма. «Выхоўваючы дзіця і прывіваючы яму неабходныя навыкі бяспечных паводзін у побыце, перш за ўсё, самі бацькі павінны паказваць належны прыклад паводзін, — звяртае ўвагу **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Задача бацькоў — максімальна засцерагчы сваё дзіця ад надзвычайнага здарэння, прывіць навыкі абачлівасці, дысцыплінаванасці і бяспечных паводзін. Размаўляйце са сваімі дзецьмі, будуйце дыялог, цікаўцеся іх справамі і жыццём. Вы павінны ведаць, з кім сябруе ваша дзіця, з кім мае стасункі, дзе бавіць вольны час. Прыводзьце прыклады, расказвайце пра розныя надзвычайныя сітуацыі, тлумачце і нагадвайце аб бяспецы. Толькі вялікім клопатам аб нашых дзецях мы зможам папярэдзіць пажары па прычыне дзіцячага свавольства з агнём, захаваць свой дом, маёмасць і самае дарагое — жыццё дзіцяці».

Не будзе лішнім навучыць дзіця правільным дзеянням пры пажары, паказаць яму магчымыя выхады для эвакуацыі. Яшчэ важна патлумачыць, чаму ў выпадку надзвычайнай сітуацыі нельга панікаваць і хавацца.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



На пажары ў Барысаве, дзе загінула двое дзяцей.

## НЕЦВЯРОЗЫЯ — У ЗОНЕ РЫЗЫКІ

Кожны дзень у МНС паступае звыш дзясятка паведамленняў аб узгаранні. Немалая доля з іх заканчваецца не толькі знішчаным жыллём, але і гібеллю чалавека. Узяць хоць бы сутачную зводку Міністэрства па надзвычайных сітуацыях за 16 кастрычніка. За адны суткі — шэсць ахвяр агню. У Чавускім раёне загінуў мужчына, папярэдняя прычына пажару — неасцярожнасць пры курэнні. У адным з прыватных дамоў у Магілёве загінулі два пенсіянеры, прычына — тая ж. Ва ўстанове аховы здароўя ад апёкаў, атрыманых у выніку ўзгарання, памёр жыхар Рэчыцы. На пажары ў Пінскім раёне без прыкмет жыцця знойдзена гаспадыня. На Салігоршчыне загінуў мужчына.

— З пачатку года ў краіне ад пажараў загінула звыш 470 чалавек, у тым ліку восем дзяцей, — паведамляе **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Яўген БАРАНОЎСКІ.** — Аналіз паказвае, што 67 працэнтаў пажараў з гібеллю людзей адбываецца ў перыяд з кастрычніка да сакавіка. Пры гэтым пік росту прыпадае на снежань — студзень. Пераважнай прычынай гібелі людзей ад пажараў з'яўляецца няведанне або грэбаванне мерамі бяспекі, так званы чалавечы фактар — бестурботныя, неасцярожныя дзеянні. Найбольшая колькасць людзей загінула ад пажараў, якія адбыліся ў аднакватэрных жылых дамах у сельскай мясцовасці, у асенне-зімовы ацяпляльны перыяд, у начны час.

Па словах афіцыйнага прадстаўніка ведамства, асноўнай прычынай гібелі людзей ад пажараў з'яўляецца неасцярожнае абыходжанне з агнём пры курэнні. Большасць загінулых былі непрацоўнымі грамадзянамі працаздольнага ўзросту і непрацуючымі пенсіянерамі, якія знаходзіліся напярэдадні пажару ў стане алкагольнага ап'янення або загінулі па віне такіх асоб.

## ПАДРЫХТУЙЦЕСЯ ДА ЗІМЫ!

З мэтай павышэння ўзроўню бяспекі насельніцтва Міністэрства па надзвычайных сітуацыях з 17 кастрычніка да 2 лістапада праводзіць рэспубліканскую пажарна-прафілактычную акцыю па папярэджанні пажараў і гібелі людзей ад іх у жыллёвым фондзе ў асенне-зімовы перыяд «За бяспеку разам». Ратавальнікі і іншыя зацікаўленыя асобы абследуюць супрацьпажарны стан домаўладанняў адзінокіх пажылых грамадзян, пенсіянераў, якія жывуць адны, інвалідаў, сем'яў, дзе дзеці знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Праводзяць з грамадзянамі тлумачальную работу па выкананні правілаў пажарнай бяспекі, інфармуюць насельніцтва аб магчымасцях дзяржаўных арганізацый па паслугах бяспекі.

Мерапрыемствы, якія праводзяцца, у першую чаргу, прызначаны найбольш уразлівым катэгорыям грамадзян, якія ў сілу свайго ўзросту і матэрыяльнага становішча не могуць прадугледзець магчымыя рызыкі. Аднак падрыхтавацца да асенне-зімовага перыяду з пункту гледжання бяспекі варта кожнаму чалавеку. Як мінімум — праверыць на спраўнасць аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі. Калі ж такія адсутнічаюць, іх неабходна ўстанавіць, прычым у кожным жылым пакоі, — такая нязначная, на першы погляд, рэч выратавала жыццё не аднаму чалавеку.

— З мэтай павышэння ўзроўню бяспекі, а таксама ўлічваючы высокую эфектыўнасць аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў (АПА), неабходна ўстанавіць у кожны жылы пакой гэты найпрасцейшы і даступны сродак супрацьпажарнай абароны, — рэкамендуе Яўген Бараноўскі. — У 2021 годзе ў краіне зарэгістравана 88 фактаў спрацоўкі АПА, дзякуючы чаму пажары былі выяўлены і ліквідаваны на пачатковай стадыі. У выніку было выратавана 97 чалавек, у тым ліку 26 дзяцей. За дзевяць месяцаў гэтага года дзякуючы аўтаномным пажарным апавяшчальнікам другое жыццё атрымалі 48 чалавек, з іх — 13 дзяцей.

У гэты перыяд важна пракантраляваць і спраўнасць ацяпляльнага абсталявання, электрычнай праводкі. Асабліва ўважліва да пытання бяспекі варта падысці тым, хто ў якасці абагрэву выкарыстоўвае пячное ацяпленне. Няспраўная печ, няправільная яе эксплуатацыя — прычыны многіх пажараў з трагічным фіналам. Асабліва гэта датычыцца ўладальнікаў прыватных жылых дамоў — варта набыць і размясціць у сябе ў домаўладанні вогнетушыцель.

У МНС рэкамендуюць наведаць родных і блізкіх, якія жывуць у сельскай мясцовасці, дапамагчы ім падрыхтавацца да ацяпляльнага сезона. Калі ж яны гэта ўжо зрабілі, не будзе лішнім пракантраляваць, наколькі якасна печ падрыхтавана да зімы. У адпаведнасці з беларускім заканадаўствам, адказнасць за выкананне патрабаванняў пажарнай бяспекі ў жылых дамах, якія належаць грамадзянам на правах прыватнай уласнасці, ускладзена на іх уласнікаў.

### КАБ ПРАДУХІЛІЦЬ ДЗІЦЯЧАЕ СВАВОЛЬСТВА З АГНЁМ:

— не пакідайце малалетніх дзяцей без нагляду;
— сачыце за тым, як дзеці праводзяць вольны час, чым цікавяцца, адцягвайце іх ад бескарыснага баўлення часу;
— хавайце ад дзіцяці запалкі, запальніцы;
— не давярайце дзецям назіраць за электрапрыборамі, печамі і газавай плітой;
— устанавіце ахоўныя прылады на штэпсельныя разеткі: яны зніжаюць рызыку электратраўмы ў дамах, дзе выхоўваецца малыя дзеці;
— рэгулярна правярайце бытавую тэхніку на наяўнасць пашкоджанняў;
— патлумачце дзецям, што нельга карыстацца электрапрыборамі без дазволу дарослых.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Мінскага абласнога ўпраўлення МНС.**

І так бывае...

## ТАКСІСТ СКРАЎ РЭЧЫ І ГРОШЫ ПАСАЖЫРА

**У міліцыю звярнуўся 54-гадовы жыхар Мінска, які паведаміў аб знікненні буйной сумы грошай.**

Як аказалася, напярэдадні пацярпелы адпачываў у адной з забаўляльных устаноў Брэста. Затым ён вырашыў наведаць іншую ўстанову. Каля апоўначы мужчына скарыстаўся паслугамі мясцовага таксі. Прыехаўшы ў патрэбнае месца, кліент выйшаў з аўтамабіля. Свае рэчы ён забыўся ў салоне аўто, чым і скарыстаўся нядобранадзейны кіроўца. Фігурант не разгубіўся і забраў сумку кліента, у якой знаходзіліся: дакументы, сцізорык, ліхтарык, ключ ад аўтамабіля і 3850 долараў.

Як паведамляе падрабязнасці УУС Брэсцкага аблвыканкама, пра знікненне мінчанін згадаў раніцай, аднак у міліцыю звярнуўся праз тры дні. Увесь гэты час ён самастойна спрабаваў вярнуць грошы і дакументы. Грамадзянін высветліў нумар кіроўцы таксі, патэлефанаваў яму і папрасіў вярнуць рэчы, але той сказаў, што не мае ніякага дачынення да здарэння і выказаў здагадку, што сумку мог забраць адзін з кліентаў.

Праз некаторы час 35-гадоваму жыхару Брэста прыйшлося паразмаўляць з праваахоўнікамі. Міліцыянерам ён не спяшаўся прызнавацца: расказаў версію аб тым, што не чапаў чужое, а рэчы мог забраць любы з кліентаў. Прафесійныя дзеянні супрацоўнікаў Маскоўскага РУУС вывелі падазраванага на чыстую ваду. Мужчына прызнаўся ў зробленым і паведаміў, што грошы ён патраціў на лячэнне сваёй бабулі, дакументы спаліў у лясным масіве, а партманэ з ключамі і іншай маёмасцю выкінуў у вадаём. Потым грамадзянін выдаў праваахоўнікам 200 долараў, якія засталіся.

Дарэчы, супрацоўнікі міліцыі разам з прадстаўнікамі МНС адшукалі частку ацалелых рэчаў і вярнулі іх пацярпеламу.

Раней фігурант ужо трапляў у поле зроку праваахоўнікаў. На мужчыну следчыя пачалі крымінальную справу за крадзеж.

## НЕ ЗДАЎ ЭКЗАМЕН — «ЗАМІНІРАВАЎ» ДАІ

**Тэлефоннае паведамленне аб небяспецы ў канцы ліпеня паступіла ў Мазырскі РАУС. На шчасце, трывога аказалася лжывай, і выбухной прылады ў мясцовай ДАІ не знайшлі.**

Супрацоўнікі ўпраўлення па Гомельскай вобласці ГУУБ МУС устанавілі, што тэлефонным хуліганам аказаўся 19-гадовы жыхар Нараўлянскага раёна. Яго затрымалі пры падтрымцы СОБРа на наступны дзень. Па словах падазраванага, ён не здаў унутраны экзамен у аўташколе ДТСААФ, а бацькам схлусіў. Маўляў, выпрабаванне прайшоў — пацвердзіць званне кіроўцы заставалася толькі ў ДАІ.

У дачыненні да затрыманага была заведзена крымінальная справа па факце завядома лжывага паведамлення аб небяспецы. У Мазырскім раённым судзе адбылося пасяджэнне па гэтай справе. Абвінавачаны сваю віну цалкам прызнаў, у зробленым раскаяўся. Прыгаворам суда яму было прызначана пакаранне ў выглядзе штрафу ў памеры 100 базавых велічынь.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# «ЗЯМЕЛЬНАЯ АМНІСТЫЯ»...

## З дакладнасцю ювеліра

Перад тым як змяняць заканадаўства, адзначыў Сяргей Кастроў, ва ўсіх рэгіёнах краіны было праведзена сацыялагічнае апытанне насельніцтва. Грамадзяне выказалі праблемы, якія іх хвалююць. Акрамя таго, быў праведзены аналіз сітуацыі з зямельнымі ўладальнікамі. «Не сакрэт, што ў нас сёння ёсць чарга маючых патрэбу на атрыманне зямельных участкаў. У той жа час колькасць участкаў, якія ім могуць быць прапанаваныя, мінімальная. Таму з улікам прапаноў грамадзян і патрабаванняў, якія наспелі з часам, ва ўзаемадзеянні з выканаўчай уладай і было скарэкціравана заканадаўства», — адзначыў ён.

Эксперт дадаў, што ўлічваліся не толькі прапановы грамадзян, але і інтарэсы мясцовых органаў улады, каб на месцах вырашыць шэраг існуючых праблем: «Разам з тым вырашыць іх у рамках таго заканадаўства, якое дзейнічала, не было магчыма».

## 15 «сотак» у Мінску, а ў рэгіёнах бяры хоць гектар

Начальнік галоўнага ўпраўлення расказаў, якой будзе лімітавая плошча зямельнага ўчастка ў адпаведнасці з новымі нормамі.

Няўжо плошчу такіх участкаў дазволілі павялічыць?

«Мінімальная плошча зямельнага ўчастка, якая можа быць выдзелена ў Мінску, складае ад 0,05 га да 0,15 га, у той жа час у населеных пунктах, якія былі ўключаны ў мяжу Мінска, плошчы ўчасткаў былі большымі. Каб неяк вырашыць гэта, плошча, якая перавышае 15 «сотак», выдзялялася для агародніцтва. Разам з тым на такіх участках былі размешчаны нейкія будынкі. Сёння, згодна з заканадаўствам, у Мінску і абласных цэнтрах новая плошча не павінна перавышаць 0,15 га», — удакладніў спецыяліст.

Ён дадаў, што ў іншых гарадах, пасёлках гарадскога тыпу або гарадскіх пасёлках, максімальная плошча не павінна перавышаць 0,25 га, а ў сельскіх населеных пунктах — да 1 га. Пры стварэнні хутароў такая плошча вызначаецца органамі мясцовай улады і можа быць нават звыш гектара, зыходзячы з мясцовых умоў і патрэб. Пры выдзяленні ў Мінску і абласных цэнтрах зямельных участкаў, якія знаходзяцца ў карыстанні грамадзян і на якіх размешчаны будынкі, дапускаецца плошча да 0,3 га.

**Начальнік упраўлення землеўпарадкавання Віцебскага аблвыканкама Ігар ЛЕВЯНКОЎ** адзначыў, што новае заканадаўства дазволіць грамадзянам пашырыць зямельныя ўчасткі да дапушчальных граніц. «Сёння грамадзяне пры наяўнасці свабодных зямель у раённым цэнтры могуць атрымаць яшчэ 5 або 10 «сотак». Для гэтага трэба звярнуцца ў райвыканкам з просьбай аб выдзяленні зямельнага ўчастка да максімальна магчымых памераў, гэта значыць да 25 «сотак», — падкрэсліў ён.

У сваю чаргу, Сяргей Кастроў дадаў, што ў выпадку, калі асноўны ўчастак выкупляўся, за дадатковы прыйдзецца заплаціць па кадастравым кошце. «Калі ж зямельны ўчастак у яго знаходзіўся на іншым відзе права — пажыццёвая спадчына або арэнда без унясення платы, — то дадаткова плаціць не трэба. Дадаткова ўчастак будзе выдзелены на тым жа праве, што і асноўны», — адзначыў ён.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Калі і па якіх правілах можна будзе адчужаць участкі і мяняць іх мэтавае прызначэнне

Удзельнікі праекта абмеркавалі абноўлены Кодэкс аб зямлі, частка нормаў якога пачала дзейнічаць з 1 верасня. Сяргей Кастроў паведаміў, што нормы, якія ўступяць у сілу з 1 студзеня 2023 года, дазволяць грамадзянам атрымліваць дадатковыя зямельныя ўчасткі без правядзення аўкцыёну і без рэканструкцыі жылых дамоў. Сяргей Кастроў падкрэсліў, што дадзеная норма датычыцца таксама юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў. Для пашырэння вытворчасці яны гэтак жа могуць атрымаць такія зямельныя ўчасткі — без правядзення аўкцыёну.

Наступная норма, якая, па словах Сяргея Кастрова, наспявала даўно, датычыцца магчымасці змены мэтавага прызначэння: «Гаворка ідзе аб зямельных участках, якія выдзелены для будаўніцтва і абслугоўвання аб'ектаў. Раней было так: калі зямельны ўчастак быў выдзелены для будаўніцтва і абслугоўвання аб'екта, то да завяршэння яго будаўніцтва мэтавае прызначэнне ўчастка змяніць было нельга. З 1 студзеня 2023 года кодэкс дазволіць тое зрабіць».

## Продаж пустых зямельных участкаў

Яшчэ адзін важны момант датычыцца зямельных участкаў, выдзеленых для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі. «Калі паглядзець на нашу карту, мы ўбачым шэраг такіх зямельных участкаў, якія размешчаны ў межах жылой забудовы, на іх можна смела будаваць жылыя дамы, яны не супярэчаць ні генпланам, ні самой забудове тэрыторыі. Але мяняць іх мэтавае прызначэнне дагэтуль было нельга», — адзначыў Сяргей Кастроў.

Змяненні закранулі і правядзенне здзелак з зямельнымі ўчасткамі, якія з 1 студзеня наступнага года можна будзе адчужаць. «Зноў жа, гэта магчыма пры выкананні шэрагу ўмоў. Раней пусты зямельны ўчастак нельга было прадаць, а сёння гэта магчыма. Але адна з важных умоў датычыцца таго, што тэрмін будаўніцтва аб'екта на такім участку не будзе мяняцца. Такім чынам, той, хто набудзе гэты зямельны ўчастак, абавязаны пабудаваць аб'ект у тэрміны, якія вызначаны першапачаткова пры выдачы дадзенага зямельнага ўчастка», — звярнуў увагу Сяргей Кастроў.

## Амністыя. Але не заўсёды і не ўсім

Абноўлены Кодэкс аб зямлі дазваляе ўзаконіць і самавольна занятыя ўчасткі. Сяргей Кастроў адзначыў, што з 1 верасня ўжо дзейнічае шэраг нормаў абноўленага Кодэкса аб зямлі. Адной з іх з'яўляецца магчымасць набыцця грамадзянамі зямельных участкаў у прыватную ўласнасць або ў арэнду з унясеннем платы за права арэнды па паніжанай цане. «Законам вызначаны адпаведныя каэфіцыенты. Каэфіцыент 0,8 прымяняецца для зямельных участкаў, якія размешчаны ў Мінску і абласных цэнтрах. Каэфіцыент 0,5 прымяняецца пры выдзяленні зямельных участкаў на іншых тэрыторыях. Такім чынам, сёння грамадзянін можа напісаць заяву ў мясцовы орган улады, і зямельны ўчастак будзе выдзелены яму ў прыватную ўласнасць з улікам паніжаючага каэфіцыента», — падкрэсліў эксперт.

Яшчэ адна важная норма датычыцца так званай зямельнай амністыі. На думку Сяргея Кастрова, яна дапаможа вырашыць шэраг пытанняў, якія доўгі час не маглі быць вырашаны, або для іх вырашэння быў неабходны ўдзел кіраўніка дзяржавы. «Гэтая норма таксама ўступіла ў сілу з 1 верасня. Пры выкананні шэрагу крытэрыяў у грамадзян будзе магчымасць узаконіць самавольна занятыя зямельныя ўчасткі, часткі гэтых участкаў або парушэнне іх мэтавага прызначэння. Згаданая норма таксама дазваляе афармляць зямельныя ўчасткі садаводчага таварыства або для фактычнага карыстання без унясення адпаведных змяненняў у праект арганізацыі і забудовы тэрыторыі. Але ёсць шэраг пэўных умоў. Адна з іх заключаецца ў тым, што садаводчае таварыства павінна быць створана да ўступлення гэтай нормы ў сілу», — падкрэсліў Сяргей Кастроў.

Як адзначыў эксперт, не ўсе выяўленыя факты парушэнняў могуць быць узаконеныя.

Выканаўчыя камітэты выявілі шэраг парушэнняў у рамках інвентарызацыі зямель. Асноўная частка парушэнняў — менавіта будаўніцтва ў сельскіх населеных пунктах розных хлявоў, гаражоў, куратнікаў плюс займанне грамадзянамі дадатковых зямель. Па кожным факце ў адрас землекарыстальнікаў будзе накіравана адпаведная інфармацыя. Але гэта не значыць, што ўсе выяўленыя факты могуць быць узаконеныя, гэта значыць, прыняць рашэнне выканаўчы камітэт можа зноў жа пры выкананні шэрагу ўмоў.

## Купіць участак для вядзення падсобнай гаспадаркі цяпер можна без рэгістрацыі па месцы

**Натарыус Гродзенскай натарыяльнай акругі Таццяна БУНАР** звярнула ўвагу на тое, што ў грамадзян з'явіцца магчымасць набываць зямельныя ўчасткі для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі без прывязкі да месца рэгістрацыі: «Цяпер, каб набыць зямельны ўчастак для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі, грамадзяне павінны быць зарэгістраваныя ў дадзеным населеным пункце. Такім чынам, яны маглі купіць зямельны ўчастак толькі па месцы жыхарства альбо ў межах сельскага выканаўчага камітэта. Новыя змяненні дазволяць зняць тое абмежаванне, і грамадзяне, якія зарэгістраваныя ў Мінску, змогуць набыць зямельны ўчастак у раёне, у сельскай мясцовасці без абавязацельства там рэгістравацца».

Начальнік упраўлення землеўпарадкавання Віцебскага аблвыканкама Ігар Левянкоў дадаў, што дадзеная норма дазволіць уцягнуць у абарот падобныя ўчасткі ў сельскай мясцовасці. «Зразумела, што колькасць грамадзян, якія пражываюць у сельскіх населеных пунктах, памяншаецца, таму новая норма дасць нам магчымасць зберагчы сельскія населеныя пункты», — падкрэсліў Ігар Левянкоў.

Таццяна Бунар адзначыла, што ўзнікаюць розныя пытанні, якія датычацца афармлення правоў на зямельныя ўчасткі і правілаў здзелкі. Напрыклад, куплі-продажу, дарэння альбо афармлення спадчынных правоў. З улікам новых змяненняў будзе зняты шэраг абмежаванняў, якія датычыліся афармлення здзелак на зямельны ўчастак», — распавяла Таццяна Бунар.

Паводле яе слоў, для грамадзян вельмі актуальным з'яўляецца пытанне, на працягу якога тэрміну



можна адчужаць (прадаць ці падарыць) зямельны ўчастак, які быў выдзелены грамадзянам, што стаяць на ўліку маючых патрэбу. У цяперашні час яны могуць прадаць такі зямельны ўчастак з моманту ўводу ў эксплуатацыю жылога дома на працягу васьмі гадоў. З улікам новых змяненняў дадзены тэрмін скарачаецца да пяці гадоў. Гэта істотнае змяненне».

## Як змяніць мэтавае прызначэнне зямельнага ўчастка?

Наступная прававая норма дазволіць змяніць мэтавае прызначэнне ўчастка. Яна ўступіць у сілу з 1 студзеня наступнага года. Па словах Сяргея Кастрова, гэта актуальная тэма, з якой звярталіся не толькі ў аблвыканкамы, але і ў Дзяржаўны камітэт па маёмасці. Звароты паступалі як ад жыхароў Брэсцкай і Магілёўскай абласцей, так і ад выканаўчай улады. Таму было прынята рашэнне змяняць мэтавае прызначэнне ўчастка ў тым выпадку, калі гэта не будзе супярэчыць забудове.

«Першае, што павінен зрабіць грамадзянін, — звярнуцца ў мясцовы выканкам з заявай. Пасля будзе неабходна набыць зямельны ўчастак у прыватную ўласнасць. У тых выпадках, калі тое зрабіць немагчыма, грамадзяніну даецца зямельны ўчастак у арэнду з унясеннем платы за права арэнды. Калі няма ніякіх перашкод, райвыканкам або сельскі Савет прымуць адпаведныя рашэнні», — удакладніў Сяргей Кастроў. Ён растлумачыў, што ўчасткі будуць выкупляцца па рознай цане — яна будзе залежаць ад месца размяшчэння ўчастка.

Старшыня аднаго садовага таварыства (Мінская вобласць) Раман Кулікоўскі адзначыў, што змяніць мэтавае прызначэнне ўчастка ў садаводчых таварыствах нельга. У іх межах зямельныя ўчасткі могуць быць выдзелены толькі для вядзення калектыўнага садаводства. «Разам з тым гэта не абмяжоўвае грамадзян ва ўвядзенні будынка. Напрыклад, садовага доміка, які не з'яўляецца жылым. Нягледзячы на тое, што часам там могуць пражываць і цэлы год пры магчымасці ацяплення, мэтавае прызначэнне будаўніцтва жылога дома яно не мае на ўвазе», — дадаў ён.

## Дом на пятачку

Ёсць яшчэ адно змяненне, якое пачне дзейнічаць з 1 студзеня 2023 года. Сяргей Кастроў нагадаў, што раней падзяліць зямельны ўчастак можна было толькі пры ўмове падзелу непасрэдна жылога дома. Пасля 1 студзеня ў грамадзян будзе магчымасць падзяліць зямлю без падзелу дома, але пры выкананні шэрага ўмоў.

«Неабходна, каб падзел не супярэчыў горадабудаўнічым нормам, а ствараемыя ўчасткі былі забяспечаны неабходнай інжынернай інфраструктурай. Акрамя таго, зямельны ўчастак неабходна набыць у прыватную ўласнасць», — падкрэсліў сцецыяліст.

Грамадзянін не зможа пабудавацца, калі яго пабудова не будзе адказваць горадабудаўнічым патрабаванням і будаўнічым нормам, працягнуў эксперт. «Не заўсёды, калі ўчастак вялікі, яго можна падзяліць і ўвесці новы будынак. Да будаўніцтва дома прад'яўляецца шэраг крытэрыяў і патрабаванняў, дзе яго можна будаваць, а дзе нельга. Для будаўніцтва дома павінна быць мінімальная інжынерная інфраструктура. Гэта значыць мусіць быць магчымасць яго падключэння да лініі электраперадачы і іншых камунікацый. Самае галоўнае — ствараемыя зямельныя ўчасткі ў ходзе падзелу павінны быць забяспечаны падыходам або праездам, каб гэта не была тэрыторыя, да якой нельга падступіцца. Вось адна з такіх умоў».

Начальнік упраўлення землеўпарадкавання Віцебскага аблвыканкама Ігар Левянкоў лічыць, што прыведзеная норма будзе запатрабаваная ў грамадзян. Паводле яго слоў, у Віцебскай вобласці дастаткова зямельных участкаў, якія могуць быць выдзелены людзям для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі, будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома. «Нават да ўступлення і распрацоўкі нарматыўнага акта людзі прыходзілі з адпаведнымі зваротамі, але раней заканадаўства не дазваляла тое зрабіць. Сёння, з улікам тых нормаў, якія ўступяць у сілу, будаўніцтва дома будзе магчымае», — канстатаваў Ігар Левянкоў.

## Дадатковы ўчастак у садаводчым таварыстве? Можна!

Адказваючы на пытанне аб асноўных зямельных праблемах, якія патрабавалі ўмяшання, Ігар Левянкоў назваў выдзяленне дадатковага зямельнага ўчастка. «Па старым заканадаўстве мы маглі даць дадатковы зямельны ўчастак толькі з аўкцыёну. Сёння ж норма новага заканадаўства дазваляе нам рабіць гэта больш спрошчана, па заяве грамадзяніна. Яна будзе падавацца ў мясцовы выканаўчы камітэт, і пасля пэўных работ зямельны ўчастак будзе выдзелены грамадзяніну», — распавёў пра змяненні спецыяліст.

Начальнік упраўлення землеўпарадкавання Віцебскага аблвыканкама закрануў і звароты садаводаў, якія таксама паступалі неаднаразова. «Людзі прасілі дадатковы зямельны ўчастак у садаводчым таварыстве. Як правіла, участкі на іх разбітыя, таму неабходная была карэкціроўка праекта арганізацыі садаводчага таварыства. Такую працэдуру неабходна было праводзіць праз выканкамы. Сёння ж дадзеная норма новага заканадаўства дазваляе тое рабіць без карэкціроўкі, на падставе заявы грамадзяніна», — дадаў Ігар Левянкоў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Векапомнае

# ПАРТЫЗАНАЎ БЫЛА ТОЛЬКІ ЖМЕНЬКА...

**Амаль 80 гадоў таму, у пачатку лістапада 1942-га, партызаны правялі ўнікальную аперацыю.**



Разведка атрада імя Дзімітрава, які дзейнічаў на тэрыторыі трох раёнаў Брэстчыны, далажыла, што з украінскай станцыі Любяшоў фашысты адпраўляюць у Германію чарговы састаў з нарабаваным дабром. Камандзіру дыверсійнай групы Аляксандру Самуйліку, ураджэнцу вёскі Мохра Іванаўскага раёна, прапанавалі захапіць эшалон і з чырвоным сцягам праехаць па нямецкім тыле.




Для здзяйснення гэтай дзёрзкай аперацыі патрабаваліся добраахвотнікі, сярод якіх аказаліся былы памочнік машыніста паравоза Юрый Логінаў, храбрыя байцы Іван Уладзіміраў, Васіль Пукемаў, Зіновій Абакумаў, Ганна Рудзько ды іншыя. Па ранейшых баях і дыверсіях Аляксандр Самуйлік добра ведаў кожнага.

І вось раніцай 6 лістапада партызан Леанід Бяссонаўскі, апрануты ў форму чыгуначніка, размахваючы чырвоным сігнальным флажком, рушыў насустрач саставу. Той рэзка збавіў ход, што дазволіла Юрыю Логінаву падняцца ў кабіну машыністаў, якія без пярэчанняў падпарадкаваліся народным мсціўцам. З вагонаў пасказалася ўстрывожаная ахова, але па ёй з засады застракаталі партызанскія аўтаматы. Частка ахоўнікаў загінула, астатнія ўцяклі ў лес.

Так пачаўся легендарны рэйс. Народныя мсціўцы прымацавалі на вагоны загадзя падрыхтаваныя лозунгі «Да здравствует 25-я годовщина Великого Октября!», «Раздавим фашистскую гадину!», да трубы паравоза прымацавалі чырвоны сцяг. З ім па варожых тылах жменька патрыётаў праехала 40 кіламетраў. На станцыях і каля вёсак састаў спыняўся, партызаны праводзілі кароткія мітынгі, заклікалі ў свае рады, раздавалі людзям нарабаванае ворагам дабро. Абоз з прадуктамі быў накіраваны і ў партызанскі атрад.

...На станцыі Вулька мсціўцы знялі чырвоны сцяг і лозунгі, з дапамогай вяскоўцаў загрузілі вагоны саломай і падпалілі. У будцы палаючага цягніка заставаўся машыніст Логінаў, які ў апошні момант, перад разбураным мостам праз раку Піна, здолеў выскачыць з паравоза, далучыцца да партызанаў, каб працягваць барацьбу супраць акупантаў.

...Летам 1943 года Аляксандр Самуйлік стаў камандзірам партызанскага атрада імя Кірава, у жніўні 1944-га за мужнасць і гераізм быў узнагароджаны ордэнам Леніна. Пасля вайны больш за 30 гадоў працаваў на розных пасадах у Камянецкім раёне, стаў ганаровым грамадзянінам горада, дзе яго імем названая вуліца.

У музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны захоўваецца самаробны сцяг «вогненнага цягніка», схема яго руху, фатаграфіі герояў — удзельнікаў рэйду і прысвечаная яму дакументальная кніга Міхася Рылько.

**Мікалай Шаўчэнка,**
*г. Мінск.*

Людзі і лёсы

# «Давай пажэнімся!»

**Тут і цяпер гэта не назва папулярнай тэлеперадачы, а канкрэтная прапанова, якую маладый чалавек зрабіў дзяўчыне... на другі дзень пасля знаёмства. І было тое не сёлета. І не летась, а... 65 гадоў таму.**

У наш горад Аляксандра прыехала па размеркаванні Навапольскага сельгастэхнікума, з дыпломам бухгалтара і... разбітым сэрцам. Радавалася, што з'язджае, што будзе далёка ад родных мясцін, дзе застаўся каханы хлопец.

— Ён быў вельмі прыгожы, — успамінае жанчына. — Мне зайздросцілі ўсе дзяўчаты, а найлепшая сяброўка ўзяла і... адбіла. Мне так крыўдна было... Але ж у слёзы не кінулася: вырашыла, што я ім яшчэ дакажу — хуценька выйду замуж... Так яно і атрымалася, прычым так нечакана, так хораша — дагэтуль здзіўляюся, — гаворыць Аляксандра Аляксандраўна і выкладвае падрабязнасці. — Працавала я тады на МТС, жыла на кватэры. Хлопец з нашай «фірмы» прапанаваў падвезці дамоў на матацыкле. Я згадзілася. Назаўтра прыйшла на работу, а мне ўсе ў адзін голас кажуць, што рэпутацыя ў дзецюка яшчэ тая, што я не з тым звязалася... Вечарам, калі зноў сустрэліся, я і кажу, што гавораць пра яго, пра нас абы-што... Косця адразу: «Хочаш, каб не гаварылі?.. Дык давай пажэнімся». Я пытаюся: «А калі?» — Ён мне: «Ды хоць сёння». — «Сёння, — кажу, — ну ніяк... Мне ж сабрацца трэба, памыць сёе-тое. Давай у сераду». Ён згадзіўся, а назаўтра ўжо назад: маўляў, мама сказала, што ў сераду ніхто не жэніцца. Лепш у выхадны, у суботу... Мы першай жа дачакаліся і ў загс.

У тую ж памятную суботу 19-гадовая нявеста пераехала ў дом жаніха і там, разам з яго бацькамі, пражыла амаль 25 гадоў.

— Свякроў мая залатым чалавекам была, — гаворыць Аляксандра Аляксандраўна. — Яшчэ пры знаёмстве сказала, што з Косцем мы добра паладзім, што характар у яго харошы... Як і ў бацькі... Свякроўку я з першага дня мамаю звала, а свёкра — татам. Яны абое на ферме працавалі, вялікую гаспадарку трымалі, нябедна жылі. Мяне адразу палюбілі: песцілі, розныя абновы спраўлялі. Я не адну аксамітавую ды шыфонавую сукенку знасіла, не адны фетравыя боцікі!

А калі першая дачушка нарадзілася, свякроў адразу ж з работы сышла, дома засталася. Мы з Косцем працавалі. Я ў леспрамгасе, райпалівазбыце, ён — зваршчыкам у райсельгасхіміі. Мы з ім адными з першых у райцэнтры легкавую машыну купілі. Косця добра іграў на гармоніку (дарэчы, як і першы мой кавалер). У любой кампаніі з ім весела было, хораша. А калі выбіраліся да маіх бацькоў, я заўжды старалася прычоску зрабіць, хораша прыбрацца... І дачушак адзявала, нібы лялек, каб па прыездзе сходзіць да той сяброўкі (мы не парывалі адносін), каб паказаць, што мне пашчасціла болей... Бо так яно і было: у сяброўчынай сям'і ні ладу, ні згоды — сваркі, папрокі, рэўнасць... У нашай...

Аляксандра Аляксандраўна не ўтойвае, што маці яе, ну вядома ж, не ўхваліла такога паспешлівага замужжа. Ды ў чужой старане... Косцю таксама прыняла не адразу. Былі на прыкмеце хлопцы са сваіх, з мясцовых, з аўтарытэтных сем'яў...

— Лёс у маёй мамы быў вельмі няпросты. Нарадзіла яна восем дзяцей, — успамінае жанчына. — На адным тыдні трое памерлі — адзёр. Двух сыноў, якія выжылі пасля цяжкай хваробы, забрала вайна: адзін загінуў на фронце, другі — у партызанах. Мама, колькі жыла, столькі іх аплаквала... І за нас, вядома ж, вельмі хвалявалася... Цяпер Аляксандры Аляксандраўне Лазоўскай 85.

«Жыццё праляцела, як адно цудоўнае імгненне!» — кажа яна, маючы 46 гадоў працоўнага стажу, вывеўшы ў людзі дзяцей, дапамогшы гадаваць унукаў і дачакаўшыся праўнукаў.

Сярод іх, дарэчы, ёсць цёзка — таксама Аляксандра Аляксандраўна. Яе фотаздымак упрыгожвае школьную Дошку гонару.

— А я, бывае, тэлефаную ў паліклініку, там адразу ўдакладняюць узрост. Дык я і кажу, што гадоў мне шмат, але я не старая. І сапраўды: не адчуваю я старасці. Не скажу, што ўсё жыццё сваё лёгка пражыла, але ж прыгожа і весела. На рабоце паважалі, маю медаль, шмат грамат. Амаль 20 гадоў была сакратаром партыйнай арганізацыі. З мужам пашчасціла (шкада, што ранавата памёр), дочкі добрыя.

...Згадзіцеся, не часта сустрэнеш чалавека, які прызнаецца, што жыццё пражыў «на выдатна».

Для гэтага, як лічыць жанчына, трэба няшмат: кожнай Аляксандры сустрэць свайго Канстанціна.

**Святлана Міхайлоўская,**
*г. Узда.*

Рэзананс

# На тое ён і апошні

**З цікавасцю заўсёды чытаю «звяздоўскую» старонку «Што людзі пішуць». Вось і на чарговай, ад 12 кастрычніка, ліст Ніны Бурко нагадаў той час, калі я працаваў старшынёй сельвыканкама, калі таксама займаўся арганізацыяй пахавання адзінокіх людзей.**

Адно з іх не забуду да скону: суседзі заўважылі, што ў хаце, дзе зусім нядаўна з'явіўся адзінокі навасёл, днём гарыць святло, а дзверы знутры замкнутыя.

Прыйшлося выклікаць участковага, запрашаць панятых, узломліваць замок, тэрмінова і на свайй машыне (ні ў міліцыі, ні ў медыкаў транспарту не аказалася) везці нябожчыка на экспертызу і толькі потым, нарэшце, ладзіць пахаванне, грошай на якое дзяржава тады не выдзяляла...

Факт, што з высновамі Ніны Бурко згаджаюся цалкам. Мы не заўсёды можам адказваць за той шлях, які чалавек выбірае сабе пры жыцці, але ў апошні — трэба праводзіць дастойна. А значыць, і рытуальныя паслугі развіваць таксама.

**Аляксандр Матошка,**
*Расонскі раён.*

Уражанні

# Вучыцца ў жыцця

**Сучасная літаратура ўсё часцей грунтуецца на фактах, на сапраўднасці. І гэта заканамерна, бо ўдумлівага чытача якраз і цікавяць рэальныя гісторыі рэальных людзей.**

Менавіта такія піша наша зямлячка Зоя Наваенка.

Лёс пісьменніцы ў многім тыповы для людзей яе пакалення: дзяцінства, якога пазбавіла вайна, школа, інстытут, больш за сорак гадоў працоўнага стажу.

І ўсё ж у лёсе Зоі Максімаўны ёсць шмат асаблівага, напоўненага штодзённымі назіраннямі за жыццём — сваім, сваіх родных і блізкіх, вучняў, сяброў, знаёмых... Менавіта яны, гэтыя ўдумлівыя назіранні, сталі асновай творчасці.

Першую аповесць Зоі Максімаўны «Детство в тумане войны» (выйшла дзесяць гадоў таму) высока ацанілі пісьменнікі Валерый Гапееў, Уладзімір Ліпскі, Тамара Краснова-Гусачэнка, Алег Ждан, паэт Алесь Жыгуноў, шматлікія прыхільнікі праўдзівага мастацкага слова.

За першай кнігай адзін за адным з'явіліся зборнікі вершаў і апавяданняў, а ў новую — «Сюрпрыз для класнага» — апроч іх, увайшлі 35 вясёлых і праўдзівых гісторый з любімай «звяздоўскай» рубрыкі «Алё, народ на праводзе!». Што адметна, пісьменніца ў сваёй творчасці не павучае чытача, не імкнецца яго перарабіць. Яна проста распавядае аб канкрэтных сітуацыях, ненавязліва прымушае задумацца і зрабіць высновы.




...«Сюрпрыз для класнага» — гэта ўжо пятая кніга Зоі Наваенкі: шчырая і праўдзівая, яна з жыцця і пра жыццё. Таму чытач лёгка «зжываецца» з яе героямі, сочыць за іх лёсамі. Да слёз кранаюць гісторыі пра вайну! А «звяздоўскія» «вясёлыя і праўдзівыя» гэтак жа, ледзь не да слёз, прымушаюць смяяцца. Па маіх назіраннях, такія кнігі маюць вялікае пазнавальнае і выхаваўчае значэнне.

...Ведаю, што не ў характары Зоі Максімаўны сядзець без справы: яна заўсёды ў страі і ў творчым пошуку. А значыць, чытач можа разлічваць на новыя цікавыя творы і новыя кнігі.

**Наталля Аўласевіч,**
**бібліятэкар,**
*г. п. Падсвілле.*

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

19 кастрычніка 2022 г. № 40 (676)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


# «ГАЛОЎНАЕ — БЫЦЬ САПРАЎДНЫМ ЧАЛАВЕКАМ»

Аб чым Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА гаварыла з навучэнцамі сярэдняй школы № 1 г. Бялынічы імя М. Пашкоўскага



Фота БелТА.

**Сустрэчы з моладдзю займаюць важнае месца ў працоўным графіку спікера верхняй палаты парламента. Моладзь, па яе словах, — будучыня нашай краіны. І клапаціцца аб тым, якой яна будзе, патрэбна ўжо сёння.**

Падчас наведвання Савета Рэспублікі школьнікі з Магілёўшчыны пазнаёміліся з музеем дзяржаўнага органа, пабывалі ў зале пасяджэнняў, дзе прымаюцца важныя заканадаўчыя рашэнні. Ужо за круглым сталом Наталля Качанава расказала хлопцам і дзяўчатам аб усіх аспектах дзейнасці Савета Рэспублікі, яго структуры і кампетэнцыях сенатараў, падзялілася, абмеркаваннем якіх законапраектаў яны займаюцца ў цяперашні момант. Нягледзячы на вялікае кола пытанняў, якія ўскладзены на парламентарыяў, рабоце з моладдзю ўдзяляецца сур'ёзная ўвага.

— Гэта прыярытэтны кірунак нашай дзяржаўнай палітыкі, — адзначыла **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.** — Прэзідэнт нашай краіны, паважаны Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, трапятліва адносіцца да дзяцей, моладзі. Мы разумеем, што вы — будучыня нашай краіны. І ад таго, як вы будзеце далей працаваць, працягваючы слаўныя традыцыі, якія былі закладзены старшым пакаленнем, у многім залежыць, якой будзе наша краіна.

Удзельнічаць у яе жыцці, уносіць канкрэтныя прапановы, каб зрабіць Беларусь яшчэ больш прыгожай і развітой, сёння можа кожны. І моладзь — не выключэнне. Аб гэтым сведчыць і дзейнасць Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь. Школьнікі з Бялыніччаў пацікавіліся ў спікера верхняй палаты, як можна стаць членам Маладзёжнага парламента і якія задачы ўскладзены на маладое пакаленне ў гэтым органе. «Мы вельмі рады таму, што сёння ў нас ёсць прадстаўнікі моладзі ў нашым парламенце, — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі. — Канкурэнцыя дастаткова сур'ёзная. Вельмі шмат маладых юнакоў і дзяўчат, з якімі мы сустракаемся, пытаюцца, як трапіць у Маладзёжны парламент. Хлопцы і дзяўчаты заўсёды працуюць з намі. Мы запрашаем іх на пасяджэнні, яны ездзяць з намі на прыёмы па асабістых справах, удзельнічаюць у шматлікіх мерапрыемствах Прэзідыума Савета Рэспублікі. Яны бачаць, якой работай мы займаемся».

Закранаючы пытанні адукацыйнага працэсу, Наталля Качанава расказала школьнікам аб тым, як ішло абмеркаванне Кодэкса аб адукацыі. У цяперашні момант у Савеце Рэспублікі ідуць дыскусіі наконт таго, якімі павінны быць выпускныя і ўступныя экзамены.

Падчас размовы спікер заўважыла: ёй расказваюць аб тым, што сучасная моладзь не глядзіць тэлебачанне, не чытае газет, толькі сядзіць у інтэрнэце. Яна пагаджаецца: прысутнасць у інтэрнэце — асаблівасць новага стагоддзя. Аднак папярэджвае моладзь аб тым, што, нягледзячы на ўсе карысныя магчымасці інтэрнэту, там дастаткова лжывай, фэйкавай інфармацыі, якая можа па-іншаму павярнуць свядомасць маладога чалавека. «Чаму такія сустрэчы важныя для нас, — звярнулася Наталля Качанава да школьнікаў. — Нам важна расказаць вам праўду. Важна, каб вы пачулі з першых вуснаў, што сёння так ці не так, правільна або не».

Дзеці скарысталіся магчымасцю задаць пытанні спікеру. Атрымаўся даверлівы дыялог, у якім не было закрытых тэм. Навучэнцаў хвалявалі асаблівасці выбарчай кампаніі ў Беларусі, удзел моладзі ў палітычным жыцці дзяржавы. Цікавіла хлопцаў і дзяўчат, што Наталля Качанава зрабіла ў першую чаргу, калі стала Старшынёй Савета Рэспублікі, якую сваю заслугу лічыць найбольш значнай і ці складана жанчыне займаць такую высокую пасаду.

Спікер, у сваю чаргу, падрыхтавала пытанні і да моладзі. Яе хвалявала, наколькі цікава сучасным дзецям вучыцца ў школе, ці шмат урокаў ім задаюць, а таксама якія прафесіі цяперашнія навучэнцы плануюць атрымаць у будучыні. Скарыстаўшыся магчымасцю, Наталля Качанава папярэдзіла дзяцей не трапляць на хітрыкі нарказлачынцаў і не весціся на лёгкія заробкі, якія могуць каштаваць вельмі дорага. Таксама Старшыня Савета Рэспублікі параіла маладому пакаленню не адмаўляць у дапамозе і падтрымцы тым, хто мае ў гэтым патрэбу, і згадала сустрэчу з дзецьмі, якія выхоўваюцца ў сацыяльным прытулку.

Напрыканцы сустрэчы Наталля Качанава параіла моладзі любіць і берагчы сваю краіну, а таксама быць шчырымі ў адносінах да самога сябе і да той справы, якой яны займаюцца. «Калі чалавек хоча чагосьці дамагчыся ў жыцці, неабавязкова быць выдатнікам у школе, — заўважыла яна. — Галоўнае — быць сапраўдным чалавекам. А сапраўдны чалавек — той, хто шчыры ў адносінах да сябе і навакольных».

Падводзячы вынікі дыялогу з моладдзю, Наталля Качанава расказала журналістам, што такія сустрэчы бясцэнныя. «Адзін з прыярытэтных кірункаў нашай сацыяльнай дзяржаўнай палітыкі — маладзёжная палітыка, — акцэнтавала ўвагу спікер. — Сустрэчы з моладдзю неабходныя: калі ты глядзіш ім вочы ў вочы, расказваеш інфармацыю, якой валодаеш. Акрамя таго, чуеш, што хвалюе дзяцей. Гэта таксама вельмі важна. Таму трэба сустракацца як мага больш. Моладзь кажа, што не глядзіць тэлебачанне, не чытае газет, а адкуль тады ўзяць праўдзівую інфармацыю аб працэсах, якія адбываюцца ўнутры нашай краіны, за яе межамі?! Такія сустрэчы павінны быць неад'емнай часткай работы любой службовай асобы, любога кіраўніка».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Заклікаем актывізаваць міжнароднае супрацоўніцтва

## Расказваем самыя важныя навіны з Савета Рэспублікі

• Пад кіраўніцтвам Наталлі Качанавай прайшло чарговае пасяджэнне экспертнага савета, тэмай якога стала ўдасканаленне мер матэрыяльнага стымулявання беларускіх спартсменаў, якія дабіліся высокіх спартыўных вынікаў, трэнераў і іншых спецыялістаў, якія забяспечылі іх падрыхтоўку. Сярод мер, накіраваных на павышэнне значнасці і важнасці заваявання залатых медалёў на Алімпійскіх гульнях, чэмпіянатах свету і Еўропы, разглядаецца магчымасць павелічэння памераў імянных стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сферы фізічнай культуры і спорту.

• Старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец узяла ўдзел у сумесным пасяджэнні камісій Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па бюджэце, падатках і фінансавым рынку і па эканамічнай палітыцы, прамысловасці і гандлі, якое адбылося ў Віцебску. Разгледжаны шырокі спектр пытанняў, якія датычацца бюджэту Саюзнай



дзяржавы. «Прыярытэтам кіравання саюзнымі сродкамі на найбліжэйшую будучыню з'яўляецца адаптацыя бюджэтнага працэсу да новых задач эканамічнай інтэграцыі Беларусі і Расіі. Саюзныя праграмы і праекты тут адыгрываюць ключавую ролю», — адзначыла сенатар.

• Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рачкоў у рамках 145-й Асамблеі Міжпарламенцкага саюза выступіў на пасяджэнні Пастаяннага камітэта МПС па справах міру і міжнароднай бяспекі. Парламентарыі правялі тэматычную дыскусію «Вайна і змяненне клімату як трыгеры неспрыяльнай харчовай сітуацыі ва ўсім свеце». Сенатар праінфармаваў калег аб палітыцы Беларусі па пытаннях змянення клімату, заснаванай на базе ў сферы нізкавугляроднай устойлівай эканомікі, а таксама аб нацыянальных намаганнях па забеспячэнні харчовай бяспекі. «Санкцыйны ціск абвастрае харчовы крызіс, які даўно наспявае. У мэтах супрацьстаяння гэтым выклікам заклікаем усе дзяржавы свету і міжнародныя арганізацыі актывізаваць міжнароднае супрацоўніцтва і аб'яднаць намаганні на шматбаковых пляцоўках, спыніць рэалізацыю неправамернай санкцыйнай палітыкі, у прыватнасці, адмяніць абмежаванні на пастаўку ўгнаенняў і забяспечыць рэалізацыю ініцыятыў, накіраваных на забеспячэнне харчаваннем краін, якія маюць патрэбу», — адзначыў у сваім выступленні Сяргей Рачкоў.

• Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар Лісковіч у рамках адзінага дня інфармавання сустрэўся з прадстаўнікамі працоўнага калектыву Брэсцкай абласной клінічнай бальніцы. У сваім выступленні сенатар акцэнтаваў увагу на няпростай знешнепалітычнай сітуацыі, становішчы на нашых паўднёвых граніцах, а таксама на заканадаўчай забароне на рост цэн, пытаннях харчовай бяспекі і аховы здароўя. Таксама сенатар адказаў на шэраг пытанняў аўдыторыі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

КАРЫСНЫ ДОСВЕД

# КУЛЬТУРА ЛЕСУ

## Як сумеснымі намаганнямі органы мясцовай улады, установы адукацыі і лесагаспадарчыя прадпрыемствы спрыяюць выхаванню экалагічнай культуры вясковых жыхароў

**Вопыт Чачэрскага раёна вывучалі дэпутаты Гомельскай вобласці. Традыцыйны выязны семінар старшынь Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню прайшоў у фармаце жывога дыялогу.**

### ШКОЛА ВОКНАМІ Ў САД

Вучні штогод вырабляюць па 600 хатак для птушак, а ад удзельнікаў шматлікіх экалагічных акцый няма адбою... Усё гэта пра Чачэрскі раён, больш за палову тэрыторыі якога — лясы.

Адной з кропак на маршруце ўдзельнікаў семінара стала Залеская сярэдняя школа. У ёй вучацца дзеці з васьмі населеных пунктаў. Пры цесным супрацоўніцтве з Чачэрскім спецлясгасам тут развіваюць экалагічнае выхаванне вучняў. Функцыянуе вучэбна-кансультацыйны цэнтр па радыяцыйнай бяспецы з усім неабходным радыеметрычным абсталяваннем. На прылеглай тэрыторыі сіламі педагогаў і вучняў закладзены пладова-ягадны гадавальнік, які налічвае звыш васьмі тысяч саджанцаў пладовых дрэў. Дзеці вучацца вырошчваць і грыбы.



Вучні і педагогі Залескай сярэдняй школы Чачэрскага раёна прадставілі вынікі работы адноснa прышкольнага гадавальніка.

На тэрыторыі Нісімкавіцкага сельсавета размешчаны тры школы. Тутэйшыя вучні і педагогі заўжды аднымі з першых прыходзяць на дапамогу супрацоўнікам лясніцтваў у навядзенні парадку і высадцы маладога лесу.

— На тэрыторыі нашага сельсавета — Нісімкавіцкае, Бабіцкае і Рудня-Барталамееўскае лясніцтвы, — звярнула ўвагу ўдзельнікаў семінара **старшыня Нісімкавіцкага сельвыканкама Жанна МАЛІНАВА.** — Гэтыя прадпрыемствы падтрымліваюць нашы ўстановы адукацыі — дапамагаюць школам з саджанцамі для школьных садоў, ніколі не адмаўляюць у дапамозе падчас добраўпарадкавання прышкольных тэрыторый.

Разам установы рыхтуюць выхаваўчыя мерапрыемствы, а на дзяржаўныя святы выступіць перад вучнямі абавязкова запрашаюць кіраўнікоў лясніцтваў. Увогуле, як адзначыла Жанна Малінава, прафесія, звязаная з лесагаспадарчай вытворчасцю, адна з самых прэстыжных для дзяцей навакольных населеных пунктаў. Многія мараць у будучым застацца жыць у родным сельсавеце і працаваць на карысць дарагога з дзяцінства лесу.

### СТАРАЖЫТНЫЯ ЛЯСНЫЯ КВАРТАЛЫ

Само лясніцтва ў Нісімкавічах мае доследна-вытворчы статус. Мясцовыя лесаводы праводзяць эксперыменты па высадцы, доглядзе і высечцы дрэў. Мясцовасць балоцістая, што не можа не ўплываць на гаспадарчую дзейнасць прадпрыемства. Пры гэтым у мясцовых лясоў — багатая культурна-гістарычная спадчына.

— Да нашых дзён у квартале 92, напрыклад, захавалася шмат курганоў-могільнікаў, якія сведчаць аб першым пасяленні людзей на чачэрскіх землях — навукоўцы ўстанавілі, што яны адносяцца да жалезнага веку, а ў квартале 47 знаходзіцца старажытнае гарадзішча, — прывялі цікавыя факты супрацоўнікі Нісімкавіцкага лясніцтва.

### ПАРТЫЗАНСКІ КРАЙ

Увогуле, гэтыя цяжкадаступныя мясціны ў вайну былі партызанскім краем. У нісімкавіцкіх лясах імкнуцца захаваць памяць аб подзвігу герояў Вялікай Айчыннай вайны. Так, недалёка ад пасёлка Яміцкі сіламі ўсіх неабыякавых вяскоўцаў захоўваецца месца базавання 1-й Гомельскай партызанскай брыгады.

— Цікавасць да гэтага месца адрадзілася пасля 1990 года. У лагеры захавалася сапраўдная партызанская лазня, гэта было вельмі цікава для турыстаў, якія прыязджалі да нас, — распавёў **дырэктар Нісімкавіцкай базавай школы Іван ПЕРАВОЗНІКАЎ.**

Сёння на месцы дыслакацыі брыгады побач з пяццю партызанскімі зямлянкамі ўсталяваны мемарыяльны знак. Некалькі гадоў таму старшыня Нісімкавіцкага сельвыканкама Жанна Малінава і кіраўнікі школ, размешчаных на тэрыторыі сельскага Савета, сваімі сіламі цалкам аднавілі «трохсценку» — цэнтральную пабудову партызанскага лагера.

— Унутры мы размяшчаем інфармацыйныя стэнды аб нашых земляках-партызанах. Доступ у зямлянкі свабодны для ўсіх, — удакладніў Іван Перавознікаў, які бярэ самы актыўны ўдзел у падрыхтоўцы экскурсій, распрацоўцы інфармацыйных стэндаў, увогуле добраўпарадкаванні знакавай для жыхароў Чачэршчыны тэрыторыі. — Вельмі папулярнае гэтае месца сярод нашых вучняў. Прыязджаюць да нас штогод і школьнікі, моладзь з самых розных гарадоў Расіі.

Даглядаць месца памяці і пад'язныя дарогі да яго дапамагаюць таксама супрацоўнікі Нісімкавіцкага лясніцтва.



Падчас наведвання вытворчага падраздзялення Чачэрскага спецлясгаса.

У самім жа пасёлку Яміцкі, размешчаным пасярод лесу, захаваўся толькі адзін дом — бацькоўская хата некалі вялікай сям'і Малінавых.

— Гэта дом бацькоў майго мужа. Вельмі шкада было пакідаць яго, каб разбураўся. Яго наша сям'я цалкам сваімі сіламіператварыла ў аграсядзібу, — падзялілася старшыня Нісімкавіцкага сельвыканкама. Самастойна сям'я Малінавых добраўпарадкавала і закінуты лясны вадаём.

* * *

Гомельская вобласць — самы лясны край Рэспублікі Беларусь, а на аднаго жыхара рэгіёна прыпадае 1,3 гектара лясоў, з запасам драўніны звыш 230 кубічных метраў, звярнула ўвагу **старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ,** падводзячы вынікі семінара. Кіраўнік дэпутацкага корпуса Гомельшчыны нагадала, наколькі важна развіваць экалагічную культуру жыхароў вобласці:

— Вопыт Чачэрскага раёна адметны шэрагам праектаў па забеспячэнні належнай аховы лясных рэсурсаў і павышэнні сацыяльна-экалагічных функцый лесу, — адзначыла Кацярына Зенкевіч. — Цікавы вопыт работы Чачэрскага раёна па выхаванні адказных адносін падрастаючага пакалення да прыроды, фарміраванні экалагічна разумных паводзінаў у навакольным асяроддзі.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

НА КАНТРОЛІ

# ДЗЯРЖАЎНЫЯ, ПРЫВАТНЫЯ, АЎТАКРАМЫ...

## Да маніторынгу цэн актыўна далучаюцца дэпутаты мясцовых Саветаў

**Пасля нарады ў Прэзідэнта і падпісанай кіраўніком дзяржавы дырэктывы маніторынг цэн па ўсёй краіне вядуць Дзяржкантроль, прафсаюзы, сенатары, дэпутаты розных узроўняў. Асаблівая ўвага звернута на кошт сацыяльна значных тавараў. Дэпутацкі корпус Пухавіцкага раёна, які налічвае 211 народных выбраннікаў, наведвае гандлёвыя пункты на падведамасных тэрыторыях.**

— Маніторынг ахоплівае як сам райцэнтр, так і сельскія населеныя пункты, — расказвае **старшыня Пухавіцкага раённага Савета дэпутатаў Марыя КЛІМОВІЧ.** — Кантралюем цэны не толькі на сацыяльна значную прадукцыю, але цікавімся і асартыментным пералікам. У чалавека павінен быць выбар за свае грошы набыць тое, што яму патрэбна. Пры наведванні гандлёвых пунктаў мы фіксуем і параўноўваем цэны на тавары першай неабходнасці. Не толькі на прадукты, але і на мыйныя і гігіенічныя сродкі. На ўсёй тэрыторыі раёна дэпутаты падключыліся да работы па маніторынгу цэн, уключаючы раённы Савет дэпутатаў і сельскія Саветы дэпутатаў. Пры наведванні гандлёвых аб'ектаў фіксуем цэны на малако, тварог, смятану, агародніну і садавіну.

Падчас маніторынгу абавязкова прысутнічае загадчык крамы або яе прадстаўнік.

У прысутнасці абодвух бакоў цэны па кожнай таварнай пазіцыі заносяцца ў своеасаблівы рэестр-ведамасць. Агульная інфармацыя па ўсіх гандлёвых аб'ектах паступае старшыні райсавета і карпатліва аналізуецца. Здараецца, і нярэдка, што адзін прадпрымальнік мае некалькі аб'ектаў у розных населеных пунктах. Тут таксама варта глядзець, каб не было вялікай разбежкі ў цэнах на аднолькавую прадукцыю.

— З гэтай табліцы я бачу, ці адпавядаюць цэны рэчаіснасці, ці няма парушэнняў у цэнаўтварэнні, ці знаходзіцца пакупнік і з розных населеных пунктаў у аднолькавых умовах, — кажа Марыя Уладзіміраўна. — Дапамагае дэпутатам працаваць аддзел эканомікі райвыканкама, правярае загадзя гэтую табліцу на адпаведнасць.

— Вы пачалі маніторынг цэн тыдзень назад. Тэрмін невялікі. Але, магчыма, ужо можаце падзяліцца вынікамі? — цікавімся ў суразмоўніцы.

— Магу сцвярджаць адназначна: парушэнняў не выяўлена. Я давяраю сваім дэпутатам. Гэта адукаваныя, вопытныя і адказныя людзі, — падкрэсліла Марыя Клімовіч. — Праўда, бывае, што ў гандлёвых пунктах адной і той жа юрыдычнай асобы цэны крыху адрозніваюцца. Гэта лагічна і звязана з дастаўкай тавараў на розныя адлегласці.

Дадам, што Пухавіцкім раённым Саветам дэпутатаў арганізаваны прамыя тэлефонныя лініі з нумарам тэлефона старшыні і спецыяліста. У першы дзень размяшчэння аб'явы сюды звярнуліся чатыры чалавекі. Але не са скаргамі. Людзей больш цікавіла фарміраванне цэн. І яны атрымалі вычарпальныя адказы ад кампетэнтных асоб. Усе пытанні, якія задаюць пакупнікі, прапрацоўваюцца з аддзелам эканомікі.

У раёне працуюць як дзяржаўныя крамы, так і прыватныя. Усе яны пастаўлены ў роўныя ўмовы. Няма такога, каб іх дзялілі выходзячы з формы ўласнасці, да адных адносіліся прыдзірліва, да іншых — паблажліва. Акрамя таго, народныя выбраннікі кантралююць цэны і асартымент тавараў у аўтакрамах, якія ходзяць у аддаленыя вёскі.

— У нас выбудавана сістэма маніторынгу. Будзем і надалей праводзіць падобную работу, бо на першым месцы для нас — людзі, — гаворыць Марыя Клімовіч.

Па дарозе на аўтавакзал я зазірнула ў два магазіны. Якраз быў абедзенны перапынак, у гандлёвых залах сабралася даволі шмат людзей. У «Прадуктовым» народ закупляўся свежымі памідорамі, агуркамі.

— Я жыву непадалёку, таму тут часта бываю, — сказала адна з пакупніц, якая прадставілася Ганнай Іванаўнай. — Мне магазін падабаецца. Я не скажу, што тут цэны завоблачныя. Зрэшты, такія ж, як усюды.

— Я спачатку абыходжу некалькі магазінаў, цікаўлюся цэнамі, а потым раблю пакупкі. Павышэння цэн таксама не прыкмеціла, — далучаецца да гутаркі іншая жанчына.

— А я як шматдзетная маці часта наведваюся ў магазіны, дзе мне належыць 10-працэнтная скідка. Купляю муку, крупы, свініну на костцы, — дзеліцца трэцяя.

Наведалася я і ў краму спажыўкааперацыі. Спадабалася тое, што сацыяльныя тавары, якія для асабліва ўразлівых катэгорый прадаюцца са зніжкай, выдзелены спецыяльнымі цэннікамі, што адразу кідаюцца ў вочы.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# «ЗНОЙДЗЕНАЯ» ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ І ПАДСЫПАНАЯ ДАРОГА

## Як сенатару ўдаецца вырашаць тыповыя і нетыповыя пытанні па зваротах грамадзян

**На прыём да сенатара людзі прыходзяць з рознымі пытаннямі. Найбольш просьбаў, паводле ацэнкі члена Савета Рэспублікі, старшыні Жабінкаўскага раённага Савета Анатоля ШАЛТАНЮКА, датычацца праблем добраўпарадкавання і жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Ёсць і іншыя нагоды для зваротаў. Бывае, што чалавек абышоў самыя розныя інстанцыі, не знайшоў падтрымкі альбо разумення, але ж праблема важная, яна застаецца, вымагае дзейнічаць далей. Менавіта такая сітуацыя і прывяла амаль год таму на прыём да сенатара Алу Яўстратаву.**

### ВЯРНУЦЬ ПРАВА ЎЛАСНАСЦІ НА ЖЫЛПЛОШЧУ

Ала Анатольеўна па прафесіі медык. Апошнія сем гадоў працуе фельчарам хуткай дапамогі. Сустракаемся з ёй, калі паміж выклікамі ў фельчара выдаецца рэдкая хвіліна перадышкі. Мая суразмоўніца расказвае, як пераехала сюды з Гомельскай вобласці пасля чарнобыльскай аварыі. Ім, як і многім тады, выдзелілі жыллё, сям'я атрымала двухпакаёвую кватэру ў Жабінцы больш за дваццаць гадоў таму. У канцы 1990-х пачалася актыўная кампанія па прыватызацыі жылля, яны з мужам таксама вырашылі прыватызаваць кватэру, узялі растэрміноўку на пяць гадоў і плацілі за прыватызацыю кожны месяц з 1999-га да 2004 года. Усё гэта праводзілася праз БТІ, так тады называлася цяперашняе агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры. Выплацілі і, як той казаў, забыліся. Праўда, квітанцыі аб аплаце яна збірала і складвала ў шуфлядку, а некалькі гадоў таму, калі рабіла рамонт, перабірала рэчы, знайшла іх, крыху пажоўклыя ад часу. І вырашыла выкінуць...



Ала Яўстратава.

І ніхто б пра іх, пэўна, да сёння не ўспомніў, каб на сямейнай нарадзе аднойчы не прынялі рашэнне аформіць гэтую кватэру ў спадчыну дачцэ. Як належыць, найперш пайшлі да натарыуса, а тая сказала, што не бачыць па дакументах, калі кватэра была прыватызаваная. Ала Анатолеўна падумала, што трэба звярнуцца ў райфінаддзел, знайсці пацвярджэнне. Тады і ў галаву не прыйшло, што яе хаджэнне па пакутах толькі пачынаецца.

Словам, у фінаддзеле нічым не дапамаглі. Як высветлілася, архівы ў іх захоўваюцца тры гады. Пісала і хадзіла ў аблвыканкам, там таксама разводзілі рукамі. Давялося звяртацца ў Нацбанк, спецыялісты якога паведамілі грамадзянцы, што інфармацыя аб плацяжах захоўваецца ў іх дзесяць гадоў. А што было раней, высветліць



> І ўсё ж вялікая частка зваротаў датычыцца стану і якасці дарог. Асабліва шмат нараканняў на дарогі з гравійным пакрыццём. Такія дарогі хутка разбіваюцца транспартам, патрабуюць пастаяннага паляпшэння.

не атрымліваецца — нейкая інфармацыйная чорная дзірка.

Ала Яўстратава згадвае, што была ў адчаі, плакала, проста не ведала, што рабіць. Выходзіла, што кватэра, у якой пражыла большую частку жыцця, за якую разлічылася ў адпаведнасці з законам, цяпер не яе. «А калі дапусціць такую сітуацыю, што нас з мужам не стала б, дзеці не змаглі б увайсці ў правы спадчыннікаў і кватэра адышла б у камунальную ўласнасць», — гаворыць жанчына.

— Склалася наогул абсурдная сітуацыя, — згадвае работу над зваротам Анатоль Шалтанюк. — Грамадзянка не можа даказаць, што яна аплаціла прыватызацыю, орган па рэгістрацыі не можа даказаць і адваротнае. Маёй перапіскі з рознымі міністэрствамі, банкаўскімі і іншымі ўстановамі сабралася амаль за год на дзве тоўстыя папкі. Відавочная яўная недапрацоўка органа, які праводзіў прыватызацыю. Варта было пасля апошняга плацяжу выклікаць грамадзяніна і выдаць адпаведны дакумент. Але тое не зрабілі. Як відавочнае і іншае: калі б чалавек з нейкай прычыны перастаў плаціць налічаныя сумы па прыватызацыі, яго выклікалі б, пісалі лісты, налічвалі пеню. Ёсць мноства пытанняў на гэты конт. Было шмат работы па высвятленні абставін, разглядаў, рашэнняў... Але галоўнае, што ў выніку ўсё ж пытанне ўдалося вырашыць на карысць заяўніцы. І 23 жніўня бягучага года ёй выдалі даведку, якая пацвердзіла плацяжы аб прыватызацыі жылога памяшкання.

— Я вельмі ўдзячная Анатолю Вітальевічу за праяўленае разуменне і настойлівасць у вырашэнні маёй праблемы, — гаворыць Ала Яўстратава. — Гэта ж не дробязнае пытанне, гаворка ідзе пра цэлую кватэру.

### ДРОВЫ ДЛЯ ПРЫВАТНАГА ДОМА

Але ж любое пытанне, з якім звяртаецца чалавек, для дэпутата і старшыні райсавета не выглядае дробязным. Такім аказалася, напрыклад, нарыхтоўка дроў для інваліда першай групы Ніны Кавальчук.

Ніна Іосіфаўна жыве на самай ускраіне раённага цэнтра: калі едзеш там, можна падумаць, што горад ужо скончыўся і пачаўся сельскі населены пункт. Але гэта яшчэ гарадская мяжа, і згодна з рэгістрацыяй у доме па вуліцы Лугавой, яна гараджанка. Жанчына перанесла некалькі складаных аперацый, цяпер яна не ходзіць. «Без нечага 40 гадоў адпрацавала ў гандлі, заўсёды была актыўная і рухавая, а цяпер вось прыкаваная да ложка, — расказвае пра сваё жыццё Ніна Іосіфаўна. — Маю чэкі «Жыллё», думала з іх дапамогай атрымаць аднапакаёвую кватэру, але мне сказалі, што маю ва ўласнасці дом, таму на льготу нават як інвалід першай групы не маю права. Выходзіць, трэба жыць тут, у доме без выгод з пячным ацяпленнем.



Ніна Кавальчук.

На зіму, як заўсёды, заказвала дровы, іх дастаўлялі, а на гэты раз паліва не прывозілі, расказвае Ніна Іосіфаўна. «Тлумачылі, што нейкія там праблемы ўзніклі, а то і наогул дазваніцца было нельга. Я прывыкла ўсё рабіць загадзя, не ў апошні момант, а тут лета пераваліла за другую палову, а дроў няма. Патэлефанавала на прамую лінію да сенатара, і пасля таго дровы мне прывезлі хутка».

### ВУЛІЦЫ, ПРЫПЫНКІ, ТРАНСПАРТ

І ўсё ж вялікая частка зваротаў датычыцца стану і якасці дарог. Асабліва шмат нараканняў на дарогі з гравійным пакрыццём. Такія дарогі хутка разбіваюцца транспартам, патрабуюць пастаяннага паляпшэння. Жыхар дома па вуліцы Міцкевіча Мікалай Канстанцінавіч папрасіў паспрыяць, каб дарогу на іх вуліцы адрамантавалі, падсыпалі пясчана-гравійнай сумессю. Апошняе было зроблена ў жніўні, і цяпер дарога выглядае цалкам прыстойна, па ёй можна ехаць любым транспартам.

З просьбай палепшыць дарогу звярнуўся да сенатара і жыхар дома па вуліцы Машэрава Генадзь А. Грамадзянін прасіў пашырыць з'езд на іх вуліцу з вуліцы Камсамольскай, заасфальтаваць яго. З'езд пашыраны, а вось асфальт пакуль не пакладзены, хоць райвыканкам у сваім пісьме паведаміў аб планах завяршыць згаданую работу да канца верасня. Надвор'е дазваляе, і будаўнічая арганізацыя зможа правесці работы яшчэ і ў кастрычніку.

У акругу сенатара Шалтанюка ўваходзіць таксама Брэсцкі раён. На адзін з прыёмаў прыйшоў жыхар вёскі Малыя Радванічы. Мікалай Канстанцінавіч агучыў просьбу многіх жыхароў вёскі Франопаль — прадоўжыць маршрут аўтобуса № 231 «Брэст — Радванічы» да Франопаля. Праблема аказалася не вельмі простай для вырашэння. Каб пусціць туды аўтобус, спатрэбілася абсталяваць разваротнае кола,

> Ала Яўстратава згадвае, што была ў адчаі, плакала, проста не ведала, што рабіць. Выходзіла, што кватэра, у якой пражыла большую частку жыцця, за якую разлічылася ў адпаведнасці з законам, цяпер не яе.

а таксама ўладкаваць прыпыначны пункт. Як паведаміла старшыня Радваніцкага сельскага Савета Наталля Драневіч, цяпер разваротнае кола абсталявана, вядзецца работа па ўстаноўцы прыпыначнага пункта.

На тым прыёме заяўнік таксама ўзняў праблему нездавальняючай якасці вады ў Малых Радванічах. Для паляпшэння якасці патрэбная станцыя абезжалезвання. Паводле інфармацыі кіраўніка мясцовай улады, падрыхтаваны ўсе дакументы для праектавання аб'екта «Будаўніцтва станцыі абезжалезвання ў вёсцы Малыя Радванічы». Грошы на праект з абласнога бюджэту не толькі выдзелены, але і асвоены. Цяпер праект праходзіць стадыю дзяржаўнай экспертызы. Гэта значыць, пытанне зрушылася з месца, як той казаў, працэс пайшоў.

— Звароты бываюць розныя, — гаворыць Анатоль Шалтанюк. — І калі дробныя пытанні, накшталт бягучага рамонту дарогі ці расчысткі ад снегу вырашаюцца аператыўна і ў рабочым парадку, то іншыя праблемы, на вырашэнне якіх патрэбныя сродкі, заносяцца ў своеасаблівы «спіс чакання». Як правіла, да дэпутата альбо сенатара прыходзяць пасля таго, як ужо звярталіся ў мясцовыя органы ўлады. Там ведаюць пра наяўнасць праблемы. З раённымі выканаўчымі камітэтамі мы вядзём работу так, каб складаць перспектыўныя планы чарговасці любой работы. Скажам, гаворка ідзе пра капітальны рамонт жылых дамоў: парадак альбо



З'езд па вуліцы Машэрава.

чарговасць распісваецца не менш, чым на пяць гадоў. Такім чынам можна ўбачыць, які дом на якой вуліцы будзе адрамантаваны ў першую чаргу, які за ім, які наступны. І так па ўсіх відах работ, каб чалавеку можна было даць зразумелы адказ і каб ён ведаў, калі чакаць рамонту альбо добраўпарадкавання.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

ЧАЛАВЕЧЫ ФАКТАР

# «ВАЖНА ЗАХАВАЦЬ ДАВЕР ДЗЯЦЕЙ»

## Старшыня сельвыканкама адзін выхоўвае траіх дзяцей і спраўляецца з адказнай пасадай

**Неаднойчы даводзілася сустракацца з Андрэем Мацкевічам у рамках яго службовай дзейнасці. І тады, калі ён працаваў дырэктарам дзіцячага летніка «Сузор'е», і апошнім часам, калі Андрэй Станіслававіч стаў на чале Парэцкага сельскага выканаўчага камітэта Гродзенскага раёна. Памятаю, як у адным з нумароў «Мясцовага самакіравання» мы падрабязна разглядалі тэму добраўпарадкавання тэрыторыі сельскага Савета. У такім кантэксце, як правіла, акцэнт робіцца на справах, а не на асобе суразмоўніка. Але гэтым разам мы гутарылі на вельмі прыватную тэму, якая раскрывае старшыню сельвыканкама як клапатлівага бацьку. Ён вось ужо восьмы год адзін выхоўвае траіх дзяцей і прызнаецца, што Дзень бацькі, які сёлета будзе адзначацца ўпершыню, безумоўна, вельмі важнае свята і для яго асабіста. У першую чаргу таму, што ёсць нагода ганарыцца сваімі дзецьмі.**

Андрэя Мацкевіча можна назваць яшчэ маладым чалавекам, яму толькі 38 гадоў. Энергічны, упэўнены, у добрай фізічнай форме. Здаецца, што і «за кадрам» у яго ўсё добра, зладжана і стабільна. А між тым, у старшыні сельвыканкама свая трагедыя. Сем гадоў таму не стала яго жонкі. Яна пайшла з жыцця пасля працяглай анкалагічнай хваробы. У бацькі на руках засталося трое малых дзяцей.

— Чаму не жаніўся зноў? — перапытвае мой суразмоўнік. — Не так усё проста, калі ёсць дзеці. У гэты момант нават выключаеш усё, што навокал, бо важна захаваць давер з дзецьмі. У такі перыяд нават думкі няма, што трэба шукаць кагосьці.

— Думаеце, дзеці не маглі б тое прыняць?

— Калі чалавек застаецца без сваёй палавіны, ён нібы адразае ад сябе ўвесь навакольны свет і аддае сябе толькі дзецям. У самім чалавеку іншы раз прывыкла.

У складаны момант сапраўдным пунктам апоры сталі бацькі. Яны і сёння падтрымліваюць свайго сына і ўнукаў. Яніна Іосіфаўна доўгі час працавала ў сацыяльнай сферы, цяпер на пенсіі, а Станіслаў Вацлававіч і дагэтуль працуе на заводзе інжынерам па забеспячэнні. Яны таксама выхавалі траіх дзяцей і заўсёды гасцінна прымаюць іх з сем'ямі. Андрэй Станіслававіч расказаў, што многія традыцыі і звычаі, якія былі і застаюцца ў яго бацькоў, ён пераносіць і ў сваю ўласную сям'ю. І гэта дае свой плён. Напрыклад, рыхтаваць падарункі і збірацца разам на святы — Каляды, Новы год, Вялікдзень.

А яшчэ бацькі Андрэя сталі прыкладам таго, як важна прысвяціць сваё жыццё дзецям.

— На жаль, дзеці толькі з цягам часу разумеюць тое, што для іх зрабілі бацькі. У дзіцячым узросце ўспрымаеш сваіх бацькоў як належнае. Але калі з'яўляецца свая сям'я, свае дзеці, тады разумееш, чым прыходзілася ахвяраваць бацькам. Разумееш, што ўсё сваё жыццё яны прысвячаюць дзецям. Гэта для мяне прыклад у выхаванні, — дзеліцца сваімі думкамі старшыня сельвыканкама.



З дзецьмі Робертам і Варварай.

Калі не стала жонкі, Андрэй Мацкевіч стаў больш аналізаваць свае адносіны з бацькам. Якім ён памятае яго з дзяцінства? Што той залажыў у яго характар? Як выхоўваў? Яму ўсё гэта было важна ўсвядоміць, каб па-новаму наладжваць свае адносіны з дзецьмі. Але аказалася, на гэтыя пытанні няма канкрэтнага адказу, бо ёсць пачуццё агульнай цеплыні і надзейнага бацькоўскага пляча. «Яго пачуцці больш стрыманыя, ціхія, але пачуцці гэтыя немагчыма нічым замяніць. Яго схаваная моц, уменне прымаць удары лёсу дапамаглі мне выстаяць у складаныя моманты», — з хваляваннем кажа Андрэй Станіславіч.

— Што вы імкнуліся залажыць у дзецях, якія выхоўваюцца татам?

— Калі жыццё складваецца такім чынам, галоўнае ў гэты момант не вінаваціць нікога, у тым ліку сябе. Трэба прыняць выклік лёсу. Хоць можа падацца, што гэта немагчыма, — разважае Андрэй Станіслававіч. — Важна разумець, што трэба ісці далей, бо дзеці чакаюць, што тата будзе моцным.

Магчыма, такая ўпэўненасць дапамагае і дзецям справіцца са стратай дарагога чалавека. Яны бачаць, што тата жыве іх інтарэсамі, шмат часу аддае іх усебаковаму развіццю. І бацьку ёсць чым ганарыцца. Сын Роберт — стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі, дыпламант і лаўрэат міжнародных, рэспубліканскіх і абласных музычных конкурсаў. Дачка Лізавета — студэнтка першага курса факультэта фізічнай культуры ГрДУ імя Я. Купалы, удзельніца і пераможніца абласных і раённых спартыўных спаборніцтваў. Дачка Варвара — пераможніца раённых этапаў творчых і спартыўных конкурсаў і спартакіяд.

У сваю чаргу, дзеці з разуменнем ставяцца да работы свайго таты, падтрымліваюць яго. Андрэй Станіслававіч другі год працуе на пасадзе старшыні Парэцкага сельвыканкама. Сёння яго галоўныя планы скіраваны на добраўпарадкаванне тэрыторыі сельскага Савета, у прыватнасці аграгарадка Парэчча.

— Работа сапраўды даволі клапотная, але цяпер дзеці сталі старэйшыя, яны падтрымліваюць мяне, я гэта адчуваю, — адзначае Андрэй Мацкевіч. — У іх ёсць тая мудрасць, якая павінна быць, і яны добра разумеюць, што такое татава работа, што гэта важна для людзей і для грамадства, для дзяржавы, а ў тым ліку і для іх.

Дзень бацькі абавязкова стане адным з самых знакавых свят у сям'і Мацкевічаў. Дзеці нарэшце змогуць павіншаваць свайго тату не толькі з Днём нараджэння, але і як бацьку. А напярэдадні асаблівага дня Андрэя Станіслававіча разам са шматдзетнымі сем'ямі запрасілі на прыём да губернатара. Дарэчы, кіраўнік рэгіёна Уладзімір Каранік выказаў захапленне стойкім характарам старшыні Парэцкага сельвыканкама, які адзін гадуе траіх дзяцей і развівае іх таленты. Сам Андрэй Станіслававіч лічыць важным аддаваць даніну памяці жонцы, якая пайшла з жыцця. Разам з тым, на яго думку, варта знайсці ў сабе сілы жыць далей і працягваць будаваць свой лёс.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота з архіва героя.**

# СЛОВА НАРОЎНІ З ЛЕКАМІ

## Як працуе малады спецыяліст у вясковай амбулаторыі

**Сужэнцы Пётр Іосіфавіч і Ганна Андрэеўна НАВУМЧЫКІ летась хварэлі на ковід даволі цяжка. Жонку давялося тэрмінова шпіталізаваць у бальніцу райцэнтра. Муж лячыўся дома. У самы складаны перыяд хворага кожны дзень наведвала ўрач Моладаўскай амбулаторыі Аліна КОМАР.**

— Мы такога ўважлівага доктара за ўсё жыццё не бачылі, — ледзь не ў адзін голас даводзяць пенсіянеры. — Уяўляеце, калі ў яе не было машыны, яна спадарожным транспартам дабіралася ў вёску і праводзіла агляд! Як жа тое важна было тады: не толькі лекі, але і падтрымка! Мы ж пра гэтую навалу раней нічога не ведалі, таму і баяліся, рознае тады гаварылася. А тут доктар зойдзе, бадзёрым голасам скажа, што ўсё будзе добра. Дык лягчэй станавілася адразу...

У Бусе Іванаўскага раёна нядаўна давялося быць зусім з іншай нагоды. Але мае героі вельмі ж прасілі абавязкова напісаць пра іх маладога доктара. Давялося даць абяцанне, якое выконваю.

